ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 10 (973) | Субота, 6 сакавіка 1954 года | Цана 50 кап.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ
аб Пленуме Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай партыі Совецкага Саюза

Днямі адбыўся Пленум Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай партыі Совецкага Саюза.

Пленум заслухаў і абмеркаваў даклад тав. Хрушчова Н. С. аб далейшым павелічэнні вытворчасці збожжа ў краіне і аб асваенні цалінных і абложных земляў і прыняў адпаведную пастанову.

У абмеркаванні гэтага пытання прынялі ўдзел работнікі мясцовых партыйных, совецкіх, сельскагаспадарчых і нарыхтоўчых органаў, старшыні калгасаў і работнікі соўгасаў.

Пад сцягам Леніна — Сталіна

Споўнілася першая гадавіна з таго сумнага дня, калі адыйшоў ад нас Іосіф Вісарыёнавіч Сталін.

З'яўляючыся верным вучнем геніяльнага Леніна, вялікім прадаўжальнікам яго справы, І. В. Сталін аддаў усё сваё жыццё самаадданаму служэнню народу, самаахвярнай барацьбе за вызваленне рабочага класа і ўсіх працоўных з капіталістычнага рабства, за свабоднае і шчаслівае жыццё на зямлі для працоўнага чалавека.

Ідучы па шляху, асветленым рэволюцыйным геніем Леніна, І. В. Сталін усё жыццё нястомна змагаўся за ажыццяўленне ідэй ленінізма, аддаючы вялікай справе перамогі комунізма ўсе свае сілы, усе свае здольнасці, усю палымянасць свайго сэрца.

Трыццаць год пасля смерці В. І. Леніна Комуністычная партыя пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэта на чале з І. В. Сталіным упэўнена і цвёрда вяла совецкі народ па ленінскаму шляху, нястомна ўмацоўваючы нашу дзяржаву — Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

У справаздачным дакладзе XIX з'езду партыі аб рабоце Цэнтральнага Камітэта таварыш Г. М. Маленкоў гаварыў: «Мы не мелі-б тых поспехаў у нашым мірным будаўніцтве, якімі мы цяпер ганарымся, калі-б дапусцілі аслабленне нашай дзяржавы. Мы аказаліся-б бяззбройнымі перад тварам ворагаў і перад небяспекай ваеннага разгрому, калі-б не ўмацоўвалі нашу дзяржаву, нашу армію, нашы карныя і разведчыя органы. Партыя ператварыла Совецкую краіну ў несакрушальную цвярдыню соцыялізма таму, што яна ўсямерна ўмацоўвала і ўмацоўвае соцыялістычную дзяржаву».

Партыя комуністаў заўсёды смела і да канца абараняла інтарэсы совецкага народа, арганізуючы і накіроўваючы дзейнасць Совецкай дзяржавы ў цяжкія гады Вялікай Айчыннай вайны. Рашэннем Цэнтральнага Камітэта партыі і Совецкага Ўрада на чале Узброеных Сіл Совецкай дзяржавы быў пастаўлены І. В. Сталін. Пад кіраўніцтвам роднай Комуністычнай партыі совецкі народ здабыў сусветна-гістарычную перамогу, адстаяў свабоду і незалежнасць сваёй Радзімы, выратаваў чалавецтва ад фашысцкай тыраніі. Вайна яшчэ раз перад усім светам паказала непераможную жыццёвую сілу совецкага грамадскага і дзяржаўнага ладу, сілу палітыкі нашай партыі.

Вялікая партыя комуністаў узняла совецкі народ на ажыццяўленне грандыёзнай праграмы далейшага будаўніцтва комунізма ў нашай краіне.

Энергічная, паслядоўная барацьба Комуністычнай партыі і Совецкага ўрада за мір ва ўсім свеце, супраць падпальшчыкаў новай вайны — гэта ёсць палітыка, якая выходзіць з жыццёвых інтарэсаў усіх народаў, што жадаюць міру і ненавідзяць вайну. Клопаты Комуністычнай партыі і Совецкага ўрада аб добрабыце народа, аб найбольшым задавальненні яго няспынна растучых матэрыяльных і культурных патрэб — гэта ёсць палітыка, якая выходзіць з жыццёвых інтарэсаў народа. Совецкія людзі самаадданa змагаюцца за выкананне пастаўленай партыяй задачы — на працягу бліжэйшых двух-трох год значна павысіць забяспечанасць насельніцтва краіны харчовымі і прамысловымі таварамі масавага спажывання.

У інтарэсах совецкага народа Комуністычная партыя дабіваецца багацця духоўнай культуры ў нашай краіне. Ідэйны і культурны ўзровень совецкага чалавека нязмерна вырас, яго густ выхоўваецца партыяй на лепшых творах літаратуры і мастацтва. Совецкія людзі не церпяць пэрасці, безыдэйнасці, фальшу і прад'яўляюць высокія патрабаванні да творчасці нашых пісьменнікаў і мастакоў.

Наша совецкая літаратура і мастацтва, вучыць партыя, павінны смела паказваць жыццёвыя супярэчнасці і канфлікты, умець карыстацца зброяй крытыкі як дзейсным сродкам выхавання. Сіла і значэнне рэалістычнага мастацтва заключаецца ў тым, што яно павінна выяўляць і раскрываць высокія душэўныя якасці і рысы характару совецкага чалавека, ствараць яго яркі мастацкі вобраз, варты быць прыкладам і ўзорам пераймання для людзей.

Усё для совецкага чалавека, у імя яго шчасця і радасці — такі дэвіз Комуністычнай партыі, які вызначае сутнасць яе палітыкі, усіх яе клопатаў. Любоў і давер'е народа да Комуністычнай партыі, аўтарытэт партыі набыты яе нястомнай работай у масах, яе жыццёвай палітыкай. Калектыўны вопыт і калектыўная мудрасць Цэнтральнага Камітэта, якія грунтуюцца на трывалай аснове тэорыі Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна, на творчай энергіі і самадзейнасці народных мас, забяспечваюць правільнасць кіраўніцтва партыяй і краінай. «Наша партыя ведае, куды весці справу, і вядзе яе наперад з поспехам». Гэтак Іосіф Вісарыёнавіч Сталін гаварыў аб вялікай Комуністычнай партыі.

Бязмежнай верай у народ прасякнута ўся дзейнасць Комуністычнай партыі. У народзе партыя бачыць творцу ўсіх матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, творцу гісторыі, галоўную рухаючую сілу грамадскага развіцця на шляху да комунізма. У народзе партыя бачыць невычарпальную крыніцу энергіі, здольнай ажыццявіць самыя смелыя і высокія замыслы і планы. Комунізм, вучыць партыя, — гэта вынік свядомай творчасці мільённых мас працоўных. Да далейшага, яшчэ больш шырокага разгортвання творчай ініцыятывы заклікае совецкіх людзей Комуністычная партыя — натхніцель і арганізатар будаўніцтва комунізма ў нашай краіне. І совецкі народ — народ-герой, змагар і творца — яшчэ цясней згуртоўваецца вакол роднай Комуністычнай партыі і пад яе слаўным сцягам упэўнена ідзе па шляху да поўнай перамогі вялікай справы Леніна — Сталіна.

ВЯЛІКІ ПРАДАЎЖАЛЬНІК СПРАВЫ ЛЕНІНА

Год назад, 5 сакавіка 1953 года, памёр Іосіф Вісарыёнавіч Сталін — верны вучань і саратнік геніяльнага Леніна, вялікі прадаўжальнік яго справы.

Імя І. В. Сталіна бясконца дарагое народам нашай краіны, працоўным усяго свету. Усё яго жыццё было аддадзена вялікай справе вызвалення рабочага класа і ўсіх працоўных ад прыгнёту эксплуататараў, справе барацьбы за перамогу комунізма. Жыццё і дзейнасць І. В. Сталіна — натхняльны прыклад служэння народу, гераічнай, самаадданай барацьбы за інтарэсы працоўных мас, за іх свабоднае і шчаслівае жыццё.

Звыш поўстагоддзя назад, калі пад кіраўніцтвам В. І. Леніна ажыццяўляліся першыя крокі ў будаўніцтве рэволюцыйнай марксісцкай партыі ў Расіі, І. В. Сталін пранікнуўся бязмежнай верай у рэволюцыйны геній Леніна і пайшоў па ленінскаму шляху. Ён нястомна змагаўся за ажыццяўленне ідэй ленінізма. «Што датычыць мяне, — гаварыў І. В. Сталін, — то я толькі вучань Леніна і мэта майго жыцця — быць дастойным яго вучнем» (Творы, том 13, стар. 105).

Кіруючыся вучэннем В. І. Леніна, І. В. Сталін абараняў ад пасягання ў апартуністаў ленінскія ідэалагічныя, арганізацыйныя, тактычныя і тэарэтычныя асновы партыі, з'ядноўваў партыйныя масы пад баявым сцягам ленінізма.

Створаная і выкаваная геніем рэволюцыі Леніным, наша партыя прайшла слаўны поўвяковы шлях гераічнай барацьбы, цяжкіх выпрабаванняў і сусветна-гістарычных перамог.

Арганізаваўшы баявы саюз рабочага класа і працоўнага сялянства, Комуністычная партыя на чале з геніем чалавецтва В. І. Леніным забяспечыла перамогу Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, устанаўленне дыктатуры пролетарыята. Перамога Кастрычніцкай рэволюцыі адкрыла новую эру ў гісторыі чалавецтва — эру крушэння капіталізма і перамогі комунізма.

Пасля перамогі Кастрычніцкай рэволюцыі Комуністычная партыя стала правячай партыяй, кіруючай і накіроўваючай сілай Совецкай дзяржавы. Перад ёй з усёй вастрынёй сталі складанейшыя задачы стварэння новай, соцыялістычнай дзяржавы і пабудовы соцыялізма. І. В. Сталін быў бліжэйшым памочнікам В. І. Леніна ў будаўніцтве і ўмацаванні першай у свеце соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян. У суровыя гады грамадзянскай вайны і інтэрвенцыі Цэнтральны Камітэт партыі, В. І. Ленін пасылалі І. В. Сталіна на самыя небяспечныя ўчасткі фронта. Сваёй жалезнай воляй і ўменнем арганізаваць масы, сваім палкаводчым майстэрствам І. В. Сталін паслядоўна дамагаўся ажыццяўлення ленінскага плана разгрому белагвардзейцаў і інтэрвентаў на франтах грамадзянскай вайны.

Партыя пад кіраўніцтвам В. І. Леніна правяла велізарную работу па аб'еднанню совецкіх рэспублік у адну саюзную дзяржаву — Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік. У ажыццяўленне гэтай гістарычнай задачы шмат працы ўклаў І. В. Сталін. Утварэнне СССР з'явілася пераломным момантам у гісторыі народаў нашай краіны, вялікай вяхой ва ўмацаванні совецкай улады. Совецкі Саюз развіўся ў сур'ёзную міжнародную сілу, якая можа ўздзейнічаць на міжнароднае становішча і змяніць яго ў інтарэсах працоўных.

* * *

Пасля ўстанаўлення дыктатуры пролетарыята перад Комуністычнай партыяй, як правячай партыяй, узніклі грандыёзныя задачы пабудовы новай соцыялістычнай дзяржавы. Правадыр Комуністычнай партыі, старшыня Совецкага ўрада В. І. Ленін распрацаваў навукова-абгрунтаваную праграму пераўтварэння эканамічна-адсталай Расіі ў перадавую, магутную соцыялістычную дзяржаву. Гэтая праграма прадугледжвала соцыялістычную індустрыялізацыю краіны, усебаковае развіццё цяжкай прамысловасці, электрыфікацыю ўсёй народнай гаспадаркі, правядзенне ў жыццё кааператыўнага плана пераўтварэння сельскай гаспадаркі краіны на соцыялістычных асновах, ажыццяўленне культурнай рэволюцыі.

Пасля смерці В. І. Леніна ворагі партыі і народа — трацкісты, бухарынцы, буржуазныя нацыяналісты — прабавалі збіць партыю і краіну з ленінскага шляху на шлях ліквідацыі заваёў пролетарскай рэволюцыі і рэстаўрацыі капіталістычных парадкаў. Комуністычная партыя пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэта на чале з І. В. Сталіным разграміла здрадніка́ў і капітулянтаў, адстаяла ленінізм і ўзяла рашучы курс на пабудову соцыялізма ў нашай краіне.

Разгортваючы соцыялістычнае будаўніцтва ў нашай краіне, Комуністычная партыя зыходзіла з аб'ектыўных законаў эканамічнага развіцця грамадства, з наспеўшых патрэб развіцця матэрыяльнага жыцця грамадства, з інтарэсаў народа. Пры гэтым партыя цвёрда помніла ўказанні В. І. Леніна аб тым, што ў нашай краіне ёсць усё неабходнае і дастатковае для пабудовы поўнага соцыялістычнага грамадства.

Трыццаць год пасля смерці В. І. Леніна наша партыя пад кіраўніцтвам І. В. Сталіна вяла совецкі народ па ленінскаму шляху, па шляху ажыццяўлення геніяльнага ленінскага плана соцыялістычнага пераўтварэння нашай краіны.

Верны вучань В. І. Леніна і дастойны прадаўжальнік яго вялікай справы І. В. Сталін заўсёды заклікаў комуністаў і ўсіх совецкіх людзей вывучаць працы В. І. Леніна, кіравацца яго вучэннем, жыць і працаваць па-ленінску.

«Памятайце, любіце, вывучайце Ільіча, нашага настаўніка, нашага правадыра, — пісаў І. В. Сталін.

Змагайцеся і перамагайце ворагаў, унутраных і знешніх, — па Ільічу.

Будуйце новае жыццё, новы быт, новую культуру, — па Ільічу.

Ніколі не адмаўляйцеся ад малога ў рабоце, бо з малога будуецца вялікае, — у гэтым адзін з важных запаветаў Ільіча». (Творы, том 7, стар. 15).

Ва ўсёй сваёй дзейнасці партыя кіруецца вялікім вучэннем Маркса — Энгельса—Леніна—Сталіна, мудрымі запаветамі неўміручага стваральніка Комуністычнай партыі і заснавальніка Совецкай дзяржавы Владзіміра Ільіча Леніна. Выконваючы мудрыя запаветы В. І. Леніна, Комуністычная партыя пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэта на чале з І. В. Сталіным паслядоўна праводзіла ў жыццё палітыку індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі, ажыццявіла культурную рэволюцыю і прывяла народы нашай Радзімы да перамогі соцыялізма.

У барацьбе за пабудову соцыялізма Комуністычная партыя расла і мацнела, памнажала свае сувязі з масамі, з народам. Цэнтральны Камітэт партыі праяўляў няспынны клопат аб усемагчымым павышэнні звання і значэння члена партыі. «Мы, комуністы, — гаварыў І. В. Сталін, — людзі асобага складу. Мы скроены з асобага матэрыялу. Мы — тыя, якія складаем армію вялікага пролетарскага стратэга, армію таварыша Леніна. Няма нічога вышэй, як чэсць належаць да гэтай арміі. Няма нічога вышэй, як званне члена партыі, аснавальнікам і кіраўніком якой з'яўляецца таварыш Ленін» (Творы, том 6, стар. 46).

Комуністычная партыя смела пераадольвала цяжкасці на сваім шляху, бязлітасна ламала супраціўленне ворагаў і ўвесь час захоўвала за сабой пазіцыю вядучай сілы, цвёрда і ўпэўнена вяла совецкі народ па шляху пабудовы соцыялістычнага грамадства. У барацьбе са шматлікімі ворагамі партыя адстаяла і ўмацавала ленінскае адзінства сваіх радоў, яшчэ больш згуртавалася вакол свайго Цэнтральнага Камітэта. Маналітнае адзінства партыйных радоў было, ёсць і будзе рашаючай умовай сілы і непераможнасці партыі. Сваё вялікае гістарычнае прызванне і прызначэнне Комуністычная партыя паспяхова выконвае таму, што яна з'яўляецца маналітным калектывам аднадумцаў, згуртаваным адзінствам волі, адзінствам дзеянняў, адзінствам дысцыпліны.

Перамога соцыялізма ў СССР — рэзультат выканання мудрых запаветаў Леніна, велічны вынік тіганцкай арганізуючай і накіроўваючай дзейнасці Комуністычнай партыі, здабытак натхнёнай гераічнай працы рабочых, сялян і інтэлігенцыі.

Абагульняючы вопыт соцыялістычнага будаўніцтва ў СССР і вопыт сучаснага міжнароднага вызваленчага руху, І. В. Сталін творча развіў марксісцка-ленінскае вучэнне ў адпаведнасці з новымі гістарычнымі ўмовамі і ў радзе пытанняў узбагаціў рэволюцыйную тэорыю новымі палажэннямі. І. В. Сталін нястомна працаваў над умацаваннем Совецкай дзяржавы. Ён указваў, што сіла і магутнасць соцыялістычнай дзяржавы з'яўляецца найважнейшай умовай паспяховай пабудовы комунізма ў нашай краіне.

Крыніцай сілы і непераможнасці Совецкай дзяржавы з'яўляецца непарушны саюз рабочага класа і сялянства. В. І. Ленін і І. В. Сталін бачылі ў саюзе рабочага класа і сялянства вышэйшы прынцып дыктатуры пролетарыята. Комуністычная партыя лічыць сваім найвышэйшым абавязкам няспынна ўмацоўваць саюз рабочага класа і калгаснага сялянства — аснову магутнасці нашай Радзімы.

Асновай асноў Совецкай многанацыянальнай дзяржавы з'яўляецца дружба народаў. В. І. Ленін стварыў ідэалогію роўнапраўнасці і дружбы народаў, распрацаваў стройную тэорыю, праграму і тактыку партыі па нацыянальнаму пытанню. Ленінскія праграмныя палажэнні па нацыянальнаму пытанню атрымалі сваё далейшае развіццё ў творах І. В. Сталіна, у рашэннях партыі. Ажыццяўляючы ленінска-сталінскую нацыянальную палітыку, Комуністычная партыя з'єднала ўсе народы нашай Радзімы ў адзіную брацкую сям'ю, вялікі Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік. Дружба народаў нашай краіны стала магутнай рухаючай сілай развіцця совецкага грамадства. Над умацаваннем непарушнай дружбы народаў СССР няспынна працаваў І. В. Сталін. Комуністычная партыя захоўвае, як зрэнку вока, дружбу народаў нашай краіны, нястомна выхоўвае працоўных у духу ідэалогіі дружбы і брацтва народаў, у духу пролетарскага інтэрнацыяналізма.

Комуністычная партыя заўсёды аддавала велізарную ўвагу справе ўмацавання абароназдольнасці нашай Радзімы. У Вялікай Айчыннай вайне Комуністычная партыя выступіла як натхніцель і баявы кіраўнік совецкага народа і яго Узброеных Сіл. У дні цяжкіх выпрабаванняў яна дзейнічала як адзіная баявая арганізацыя, якая не ведае хістанняў і рознагалоссяў у сваіх радах. Рашэннем Цэнтральнага Камітэта партыі і Совецкага ўрада на чале Узброеных Сіл Совецкай дзяржавы быў пастаўлены вялікі прадаўжальнік справы Леніна І. В. Сталін. ЦК партыі накіраваў непасрэдна на ваенную работу Н. А. Булганіна, А. А. Жданава, А. С. Шчэрбакова, Н. С. Хрушчова і іншых членаў ЦК. У суровых бітвах за чэсць і незалежнасць нашай соцыялістычнай Радзімы Комуністычная партыя яшчэ больш параднілася з народам. Вайна ізноў прадэманстравала вялікую жыццёвую сілу совецкага грамадскага і дзяржаўнага ладу, мудрасць і далёкавачнасць палітыкі партыі.

У выніку разгрому гітлераўскай Германіі і імперыялістычнай Японіі ад імперыялістычнай сістэмы аднаў рад краін Еўропы і Азіі. Склаўся магутны лагер міру, дэмакратыі і соцыялізма на чале з СССР. У гэтым лагеры ў цесным брацкім еднанні ідуць наперад разам з совецкім народам вялікі кітайскі народ, брацкія народы Польшчы, Чэхаславакіі, Балгарыі, Венгрыі, Румыніі, Албаніі, Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, Мангольскай Народнай Рэспублікі. У гэтым лагеры ідуць гераічны карэйскі народ і працоўныя В'етнама, якія змагаюцца за сваю нацыянальную незалежнасць і свабоду.

* * *

Творча развіваючы тэорыю навуковага комунізма, В. І. Ленін распрацаваў навуковую праграму пабудовы комуністычнага грамадства ў СССР. У бессмяротных творах ленінскага генія дадзены асноўныя прынцыповыя, тэарэтычныя ўказанні аб шляхах руху совецкага грамадства да комунізма. Арганізуючы комуністычнае будаўніцтва, наша партыя зыходзіць з гэтых праграмных ленінскіх палажэнняў, якія атрымалі далейшае развіццё ў працах І. В. Сталіна і ў рашэннях партыі.

Кіруючыся вучэннем ленінізма, Комуністычная партыя выпрацавала навукова-абгрунтаваную і праверaную дзесяцігоддзямі барацьбы палітыку, якая адлюстроўвае патрэбы развіцця матэрыяльнага жыцця грамадства і карэнныя інтарэсы народа.

Совецкі народ адчувае бязмежнае давер'е і прасякнуты гарачай любоўю да сваёй Комуністычнай партыі, таму што ён ведае, што вышэйшым законам усёй дзейнасці партыі з'яўляецца служэнне інтарэсам народа. Працоўныя нашай краіны няўхільна кіруюцца палітыкай Комуністычнай партыі і Совецкага ўрада, якая забяспечвае далейшы росквіт нашай соцыялістычнай Радзімы.

Партыя ўсебакова развівае цяжкую прамысловасць — аснову асноў соцыялістычнай эканомікі. Поспехі, дасягнутыя ў развіцці цяжкай прамысловасці, падрыхтавалі ўмовы для крутога ўздыму вытворчасці прадметаў народнага спажывання. Комуністычная партыя і Совецкі ўрад намецілі шырокую праграму паскоранага развіцця лёгкай і харчовай прамысловасці з тым, каб на працягу двух-трох гадоў значна павысіць забяспечанасць насельніцтва краіны харчовымі і прамысловымі таварамі масавага спажывання. Практычнае вырашэнне гэтых задач з'яўляецца састаўной часткай праграмы комуністычнага будаўніцтва.

Партыя шырока выяўляе ўнутраныя рэзервы, якія таяцца ў нетрах нашай прамысловасці, для больш паспяховага выканання планавага развіцця народнай гаспадаркі. Партыя мабілізуе працоўных на ліквідацыю недахопаў у рабоце прадпрыемстваў, на разгортванне соцыялістычнага спаборніцтва за вырашэнне новых задач, якія стаяць перад нашай прамысловасцю і транспартам, за далейшае павышэнне прадукцыйнасці працы, зніжэнне сабекошту і павышэнне якасці прадукцыі, за эканомнае і разумнае выкарыстанне ўсіх нашых сродкаў і магчымасцей.

Вялікіх поспехаў дасягнула і соцыялістычная сельская гаспадарка. Калгасны лад даказаў сваю велізарную жыццёвую сілу і свае карэнныя перавагі перад любой прыватнакапіталістычнай сельскагаспадарчай вытворчасцю. Аднак партыя не можа здавольвацца гэтымі поспехамі. Яна выходзіць з няспынна растучых матэрыяльных патрэб працоўных. Без далейшага крутога ўздыму сельскай гаспадаркі нельга ў поўнай меры забяспечыць багацце прадуктаў і знайсці даволі сыравіны для нашай хуткарастучай лёгкай і харчовай прамысловасці. У пастанове верасневага Пленума ЦК КПСС і ў далейшых рашэннях партыі і ўрада па пытаннях сельскай гаспадаркі распрацавана баявая канкрэтная праграма паскоранага развіцця ўсіх галін соцыялістычнай сельскай гаспадаркі, у першую чаргу жывёлагадоўлі і вытворчасці бульбы і агародніны. Ажыццяўленне гэтай праграмы з'яўляецца надзейнай справай усёй партыі, усяго совецкага народа.

Комуністычная партыя аддае выключную ўвагу ўсебаковаму развіццю збожжавай гаспадаркі, як асновы ўсёй сельскагаспадарчай вытворчасці. Палітыка партыі накіравана на тое, каб выкарыстаць усе рэзервы і магчымасці для ўсемагчымага ўзмацнення вытворчасці збожжа. Побач з павышэннем ураджайнасці збожжавых, партыя дабіваецца асваення мільёнаў гектараў цалінных і абложных земляў, у асаблівасці ў раёнах Сібіру, Урала, Паволжжа. На заклік партыі тысячы совецкіх патрыётаў едуць у гэтыя раёны на выкананне вялікай дзяржаўнай задачы.

Совецкія людзі на сваім жыццёвым вопыце бачаць, што палітыка партыі накіравана на далейшае няўхільнае павышэнне добрабыту совецкага народа, на поўнае задавальненне яго пастаянна растучых матэрыяльных і культурных патрэб. Гэта вядаць з таго, што Совецкая дзяржава выдзяляе велізарныя сродкі на жыллёвае будаўніцтва, народную асвету, ахову здароўя, гэта знаходзіць сваё адлюстраванне таксама ў палітыцы сістэматычнага зніжэння цэн на тавары масавага спажывання і г. д.

Партыя, няўхільна ажыццяўляючы рашэнні XIX з'езда, умацоўвае адзінства і боездольнасць сваіх радоў, усебакова развівае ўнутрыпартыйную дэмакратыю, самакрытыку і ў асаблівасці крытыку знізу, паслядоўна кіруецца выпрацаванымі Леніным нормамі партыйнага жыцця і прынцыпамі партыйнага кіраўніцтва. У ленінскім вучэнні аб партыі адным з найважнейшых прынцыпаў з'яўляецца прынцып калектыўнасці партыйнага кіраўніцтва. Цэнтральны Камітэт партыі яшчэ ў дарэволюцыйныя гады В. І. Ленін называў калектывам кіраўнікоў, захавальнікам і тлумачальнікам прынцыпаў партыі. «Прынцыпы партыі захоўвае ад з'езда да з'езда і вытлумачвае іх Цэнтральны Камітэт», — указваў Ленін. Ён заўсёды дамагаўся прытрымлівання цвёрдых норм партыйнага жыцця, прадугледжаных статутам партыі.

Калектыўны вопыт і калектыўная мудрасць Цэнтральнага Камітэта, якія абапіраюцца на навуковую аснову тэорыі Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна, на творчую энергію і самадзейнасць народных мас, забяспечваюць правільнасць кіраўніцтва партыяй і краінай.

Палітыка партыі накіравана на далейшае ўмацаванне магутнасці Совецкай дзяржавы — апоры міру і бяспекі народаў. З велізарнай рашучасцю і настойлівасцю Совецкая дзяржава змагаецца за трывалы мір паміж народамі, за прадухіленне новай вайны, за ўмацаванне лагера дэмакратыі і соцыялізма.

Партыя паслядоўна праводзіць ленінскую знешнюю палітыку Совецкай дзяржавы, палітыку міру паміж народамі, заснаваную на палажэнні ленінізма аб магчымасці суіснавання і мірнага спаборніцтва двух сістэм — капіталістычнай і соцыялістычнай. «Упершыню думка аб супрацоўніцтве двух сістэм, — гаварыў І. В. Сталін, — была выказана Леніным. Ленін — наш настаўнік, а мы, совецкія людзі, — вучні Леніна. Мы ніколі не адступалі і не адступім ад указанняў Леніна» («Правда», 8 мая 1947 года).

Пільна стоячы на варце інтарэсаў народа, мірнай працы совецкіх людзей, Комуністычная партыя ўлічвае, што за мяжой ёсць рэакцыйныя імперыялістычныя сілы, якія імкнуцца абвастрыць і ўзмацніць міжнароднае напружанне, развязаць новую вайну. Таму, праводзячы цвёрда і паслядоўна палітыку міру, партыя лічыць неабходным няспынна ўдасканальваць і ўмацоўваць Узброеныя Сілы Совецкага Саюза, узнімаць пільнасць совецкага народа супраць усіх і ўсякіх падкопаў ворагаў Совецкай дзяржавы.

Абапіраючыся на вялікія перавагі совецкага соцыялістычнага ладу, Комуністычная партыя пад сцягам Леніна—Сталіна цвёрда і ўпэўнена вядзе краіну да поўнай перамогі комунізма. Совецкія людзі глыбока перакананы, што пад кіраўніцтвам сваёй роднай Комуністычнай партыі яны дасягнуць пераможнага ажыццяўлення праграмы будаўніцтва комунізма ў нашай краіне.

Кандыдаты ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР

Калгасніца Анна Каваленка

У хаце раптоўна пацямнела. Анна Міронаўна кінулася да аднаго акна, да другога. За акном круціўся шэры пыл, салома, лісце. Чуваць было, як з трэскам ламалася на дрэвах голле. Жанчына выскачыла на ганак, вецер сарваў з яе галавы хустку, але Анна не заўважыла гэтага. Яна кінулася на вуліцу.

Чорная, нізкая хмара раптоўна засланіла жнівеньскае неба.

Дзесьці блізка беглі на поле калгасніцы яе звяна. Анна першая дабегла да сцелішча. Было цёмна, і яна не ўбачыла, што нарабіла бура з ільном.

Асліпляльна ўспыхнула маланка, суха трэснуў над галавой гром. На адно імгненне ярка, нібы пры сонцы, убачыла яна знаёмы шырокі луг. Ён увесь быў у хвалях паблытанага ільну. Вецер разносіў яго ва ўсе бакі. Падбеглі калгасніцы.

— Загінуў наш лянок,—гаварылі яны.

Анна Міронаўна здрыганулася ад гэтых слоў.

— Не! — вырвалася ў яе. — Не будзе гэтага. Па саломцы перабярэм... Выратуем наш лянок.

* * *

На агульным сходзе, прысвечаным абмеркаванню вынікаў сельскагаспадарчага года, выступала многа калгаснікаў.

— Слава нашым майстрам ільну, старым і маладым, і асабліва Анне Міронаўне, якая вядзе за сабой усіх ільнаводаў,— гаварылі сяляне.

Доўга не разыходзіліся калгаснікі арцелі імя Варашылава Арэхаўскага раёна ў гэты позні студзеньскі вечар. Анна Міронаўна, не старая яшчэ жанчына сяроднятага росту, пачырванела ад пахвалы. З хваляваннем яна гаварыла:

— Адна я нічога не зрабіла. Звяно ў мяне такое дружнае, працавітае.

У канцы сваёй прамовы яна расказала:

— Бачыла я перад вайной у Маскве на выстаўцы лён. Чыстае серабро... Трыццаць шосты нумар! Вось які лён павінны мы вырошчваць!

І яна тут-жа стала гаварыць, што і як трэба рабіць, каб вырасціць яшчэ больш высокі ўраджай. Трэба, каб і ў астатніх брыгадах па-сапраўднаму за працу ўзяліся.

— Добры лён у звяне, у адной брыгадзе — гэта яшчэ толькі частка справы. Вось калі ва ўсіх брыгадах калгаса будуць высокія ўраджаі ільну, як хораша будзе!— закончыла яна.

Анна Міронаўна каля ільну ходзіць амаль трыццаць год. Яна першая ў калгасе смела пачала ўжываць перадавыя метады вырошчвання гэтай культуры.

Кандыдат у дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР па Аршанскай выбарчай акрузе № 559 Анна Міронаўна **Каваленка**—ільнавод калгаса імя Варашылава Арэхаўскага раёна Віцебскай вобласці.

У мінулым годзе, як заўсёды, звяно Анны Каваленка пасеяла лён раней за ўсіх. Потым вывела Анна Міронаўна сваіх дзяўчат на праполку пасеваў і на падкормку. Радасна было звенняваой, што расце лён густы, у «ёлачку». А вырас ён па пояс. Потым зацвіў лён. Блакітнае мора разлілося наўкола. Часцей стала хадзіць Анна Міронаўна ў поле на свой участак і раніцой, і вечарам. Але вось панёс вецер па полі блакітныя хмары пялёсткаў, якія толькі што скінуліся на зямлю. Закалыхаліся на тонкіх высокіх сцяблах каробачкі ільну, нібы маленькія званочкі. Яшчэ не звіняць яны, але папярэджваюць ужо: не зявай!

Азірнуцца не паспела Анна Міронаўна, як пазалаціўся ранняй спеласцю яе лён. Час пачынаць выбарачнае цераблення. Яго робяць у звяне Каваленка ў два прыёмы: спачатку цярэбяць доўгія сцяблы, а потым — кароткія. І звязваецца і апрацоўваецца лён таксама асобна, і ў гэтым адзін з «сакрэтаў» майстэрства Анны Міронаўны.

Растуць на ўчастку падобныя на буданы конусы выцераблёнага ільну. Сонца шчодра залівае іх цяплом і святлом. Ільносалома становіцца светлажоўтай, прыгожай, вачэй не адарвеш. Званочкамі звіняць па ветру галоўкі ільну. Можна вязаць у снапы, асцярожна, ласкава абстукваючы камлі аб зямлю, каб выраўняць сцяблы.

— Лён любіць ласку, — часта гаворыць Анна Міронаўна. — Песці лянок — і ён цябе шчодра ўзнагародзіць.

Але няма такой працы, якой-бы спалохаліся працавітыя рукі Анны Міронаўны. Чатыры дні, не разгінаючы спіны, працавала яна са сваім звяном на сцелішчы. І зноў роўнымі, тонкімі дарожкамі, саломінка да саломінкі, лёг на атаву лён. Ён купаўся ў жнівеньскіх росах, у цёплым дажджы, краса і гонар калгаса.

І аднойчы звяннявая ўзяла жменьку трасты, прасушыла яе на печы, памяла паміж далонямі, і белыя, мяккія, серабрыстага адліву валокны нібы пухам ахуталі яе пальцы. Анна Міронаўна ўважліва агледзела валакно, і задаволеная ўсмешка заззяла на яе твары.

— Добра вылежаўся, — сказала яна звяну. — Паднімайце лён, дзяўчаты!

І вось загрымела калгасная ільномялка. Павольна стукаюць трапалы, у лад ім разліваецца дзявочая песня, і гладзяць, лашчаць клапатлівыя рукі выдатнае светлае валакно. Анна Міронаўна са сваім звяном рыхтуе лён да здачы. Цяжкія скруткі валакна, нібы зліткі серабра, ляжаць на стале.

— Вось гэта восемнаццаты нумар, — паказвае яна. — А гэты — даўжэйшы, больш моцны, бачыце, дваццатым і дваццаць чацвертым пойдзе.

Трыццаць шостага, жаданага нумара яшчэ няма. Але ён будзе, абавязкова будзе!

І. СЯМЕНАЎ.

Працоўныя будні

Чуласць і ўважлівасць

Дванаццаць гадзін. Усе столікі ў рабочай сталовай завода «Большэвік» заняты. Але ў зале не адчуваецца таго нуднага чакання, якое ўласціва некаторым сталовым. Не паспее наведвальнік сесці за столік, як да яго падыходзіць афіцыянтка Ольга Якаўлеўна Гарошка, ці, як яе тут па-сяброўску называюць, — Оля. Рухавая постаць Олі кожную мінуту то з'яўляецца, то знікае ў зале.

Адзін са столікаў займае брыгада сартавальніц Тамары Петрашкевіч з першага аддзелачнага цэха. Маладыя гаварлівыя дзяўчаты.

— Добры дзень, дзяўчаткі, — чуецца ветлівы голас Олі. Яна ўжо каля століка.

— Боршч, капуста, блінцы, катлеты, цяляціна, чай,—хутка пералічвае яна назвы страў, якія павінна прынесці дзяўчатам. Праз дзве-тры мінуты сартавальніцы абедаюць.

За дваццаць мінут абедзенага перапынку (тут у кожным цэху абед у вызначаны час, па чарзе) Оля паспявае абслужыць усіх. Яна адна абслугоўвае адначасова дзесяць столікаў, яна і прыбірае з іх пасуду. Без нервознасці, залішняй мітусні падае Оля рабочым ежу. Ніколі не чулі наведвальнікі ад яе ніводнага грубага слова. У яе хапае часу і павітацца з кожным, і пажартаваць.

Ольга Якаўлеўна добра ведае ўсіх сваіх наведвальнікаў. За дзевяць год работы ў гэтай сталовай яна вывучыла густы і нават характары многіх рабочых.

Прыслухоўваецца Оля і да жадання рабочых. Неяк пачула, што рабочыя скардзіліся на аднастайнасць меню і запыталася:

— Ну, а што-б вы прапанавалі з дамашняга меню?

— Бульбяныя аладкі.

Цяпер любіцелі бульбяных аладак часта знаходзяць гэта блюда ў сталовай.

Оля любіць сваю справу. І наведвальнікі адказваюць ёй шчырай прыязню. У кнізе скарг і прапаноў можна сустрэць толькі словы ўдзячнасці за яе добрасумленнасць, чулыя адносіны да наведвальнікаў.

Чуласць, уважлівасць, спрытнасць Ольгі Якаўлеўны Гарошка, усведамленне адказнасці за даручаную ёй справу не раз адзначаліся ў загадах па Мінскаму трэсту сталовых і рэстаранаў. Некалькі год яе фатаграфія заносілася на дошку гонару трэста. Оля — прафгрупорг сталовай.

І толькі адміністрацыя і заводскі камітэт чамусьці на працягу апошніх год ні разу не адзначылі гэтага сціплага працаўніка. Між тым, Оля Гарошка вырасла на заводзе. Яна тут пачала працаваць афіцыянткай, калі ёй было шаснаццаць год. З таго часу яна няспынна клапоціцца аб рабочых завода.

Л. ДЫМАВА.

★ ★

За прылаўкам

На ўсё жыццё запомніла Ніна Рыбак бастрычніцкае свята мінулага года. Па-святочнаму прыбраная сталіца нашай Радзімы — Масква. Шырокія вуліцы велічнага горада запоўнены радаснымі масквічамі.

У адной з калон гандлёвых работнікаў Масквы ішла комсамолка Ніна Рыбак—прадаўшчыца мінскага магазіна «Гастраном» № 1. У той час яна вучылася на курсах дэкаратараў і афарміцеляў вітрын магазінаў.

Прыехаўшы з Масквы з пасведчаннем, у якім гаварылася, што Ніна Фамінічна Рыбак паспяхова закончыла курсы, дзяўчына з новым запалам узялася за працу, за вучобу.

У магазін Ніна прышла пяць год назад. Вучылася працаваць тут-жа, за прылаўкам. Вопытныя прадаўцы былі яе першымі настаўнікамі. А цяпер комсамолка Рыбак—старшы прадавец гастранамічнага аддзела. Яна вучыць цяпер моладзь, як хутка і ветліва абслугоўваць пакупніка. Майстэрства ў рабоце прышло не адразу. Многа дапамагла вучоба ў завочным гандлёвым тэхнікуме. Ніна скончыць яго летам гэтага года. Нядаўна яна здавала экзамены па арганізацыі і тэхніцы совецкага гандлю і палітэканоміі. Экзамены па гэтых прадметах яна здала на чацвёркі і пяцёркі. У чэрвені адбудуцца дзяржаўныя экзамены.

Ветлівую, уважлівую прадаўшчыцу паважаюць пакупнікі. Да яе заўсёды ідуць ахвотна. Ніна надзвычай хутка абслугоўвае пакупнікоў. За змену пры поўнай нагрузцы яна робіць па 1.500 і больш выдач.

Прадаўшчыца Рыбак ахвотна параіць, што лепш купіць і, калі ў магазіне не вельмі многа народу, раскажа, як лепш накрыць стол, што, дзе і як расставіць.

Удзячнасць пакупнікоў — найвышэйшая ўзнагарода. За пяць гадоў працы ў магазіне Ніна Фамінічна не мае ніводнай скаргі. Як старшы прадавец яна імкнецца, каб усе работнікі яе аддзела працавалі сапраўды ўзорна. Яна настойліва дабіваецца поспеху ў працы. Тры разы бездакорная праца Ніны Рыбак адзначалася прэміямі.

— Абавязак прадаўца — не толькі дакладна адважыць патрэбны тавар, але няспынна думаць, як лепш наладзіць абслугоўванне пакупнікоў, — гаворыць Ніна. — У нас яшчэ не створаны ўсе ўмовы для сапраўды культурнага гандлю. Мы, напрыклад, не маем прыгожых скрынак розных памераў, у якія можна было-б пакласці набыты пакупнікам тавар. Няма істужак, каб зрабіць сапраўды прыгожы пакунак. Слаба яшчэ распаўсюджана і дастаўка на дом прадуктаў, форма абслугоўвання, якая добра апраўдала сябе.

Не ўсё тут, вядома, залежыць ад магазіна. Аб культуры гандлю павінны значна больш клапаціцца Міністэрства гандлю БССР і іншыя гандлёвыя арганізацыі сталіцы. Іх абавязак — чула прыслухоўвацца да голасу такіх простых сціплых работнікаў прылаўка, як Ніна Фамінічна Рыбак.

Я. ДАНСКАЯ.

Медыцынская сястра

... Яго прынеслі ў партызанскі шпіталь амаль без адзнак жыцця. Ранены ў баю партызан Тунік ляжаў на ложку ў непрытомнасці.

У тую цяжкую ноч Валя Карпава ні на хвіліну не пакідала яго. Ноччу ў шпіталь зноў прышоў урач Шчатлоў. Ён уважліва паглядзеў на раненага, потым — на Валю і па яе засмучоных вачах вразумеў, што хвораму не стала лягчэй.

— За жыццё раненага, — задумліва сказаў урач, — прыдзецца нам змагацца. І гэта будзе цяжкая барацьба.

Цяпер ужо не ўспомніць, колькі бясконных начэй правяла Валянціна Фёдараўна каля ложка раненага. Ён не мог сам есці, і яго кармілі спачатку праз дзіцячую соску, а пасля — лыжачкай. Не было ў той час патрэбных дыетычных прадуктаў, і Валя рабіла далёкія небяспечныя паходы за дзесяць і больш кілометраў, каб набыць для хворага масла, дзесятак свежых яек.

Цяжка ранены партызан ачуняў. Дапамагла выратаваць яму жыццё дзяўчына ў белым халаце. З тых дзён прайшло нямала часу, а былы партызан Тунік і сёння носіць у сваім сэрцы шчырую ўдзячнасць сціплай медыцынскай сястры Валянціне Карпавай. І ці адзін ён адчувае гэта? Як у час вайны раненыя, так і цяпер хворыя хірургічнай клінікі першай совецкай бальніцы горада Мінска з любоўю называюць імя гэтага чулага, добрага чалавека.

Пасля партызанскага атрада Валянціна Фёдараўна была накіравана на работу Міністэрствам аховы здароўя БССР у хірургічную клініку. Вопыт догляду за раненымі партызанамі дапамог ёй хутка заваяваць заслужанае давер'е ўрачоў, павагу хворых. Валянціне Карпавай даручаецца догляд за самымі цяжкімі хворымі. Часта хірургі пасля складанай аперацыі выклікаюць яе і гавораць:

— Валянціна Фёдараўна, гэтага чалавека трэба выхадзіць...

І Карпава, не шкадуючы сваіх сіл, імкнецца хутчэй вярнуць здароўе аперыраванаму.

У вачах медыцынскай сястры свецяцца вялікая радасць і гонар, калі яна расказвае пра сваю родную клініку:

— Калі вы спытаеце, якая найбольшая радасць для мяне, я ўпэўнена адкажу: убачыць хворага здаровым, шчаслівым і радасным.

Я. САДОЎСКІ.

Насустрач выбарам

СУСТРЭЧА З КАМПАЗІТАРАМІ

Саюз совецкіх кампазітараў БССР правёў на выбарчым участку № 7 г. Мінска творчую сустрэчу кампазітараў з выбаршчыкамі. На сустрэчы прысутнічалі кампазітары Я. Цікоцкі, М. Аладаў, В. Яфімаў, Ул. Алоўнікаў і іншыя.

На канцэрце былі выкананы творы беларускіх кампазітараў, прысвечаныя Радзіме, партыі, абароне міру, а таксама народныя песні. У канцэрце прынялі ўдзел Дзяржаўны хор БССР пад кіраўніцтвам народнага артыста рэспублікі Р. Шырмы, артысты К. Ясінская, А. Жэзмер і іншыя.

М. ПІГУЛЕЎСКІ.

КАНЦЭРТЫ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

Рад канцэртаў для выбаршчыкаў Брагінскага раёна Гомельскай вобласці паказала мастацкая агітбрыгада раённага Дома культуры. Брыгада пабывала ў большасці калгасаў раёна.

У калгасе «Дабраволец» член агітбрыгады Г. Маслаў расказаў калгаснікам аб Усесаюзнай нарадзе работнікаў МТС у Крэмлі, у якой ён прымаў удзел.

Днямі механізатарам Брагінскай МТС быў дадзены канцэрт. Перад пачаткам канцэрта з гутаркай аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР выступіў дырэктар брагінскай сярэдняй школы Г. Друзік.

В. КУЛЯШОЎ.

ВЕЧАРАМІ У ХАЦЕ-ЧЫТАЛЬНІ

Стрэльнянская хата-чытальня Іванаўскага раёна на Піншчыне даўно стала любімым месцам культурнага адпачынку калгаснікаў сельгасарцелі «Шлях да комунізма». Добра працуе лекторый. Актыўна ўдзельнічаюць у рабоце лекторыя настаўнік А. Казлоў, аграном Л. Карпенкава, сакратар комсамольскай арганізацыі В. Такарчук і іншыя.

Рэгулярна наладжваюцца калектыўныя радыёслуханні. Настаўніца М. Якімцава правяла цікавую гутарку аб кандыдаце ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР — настаўніцы Дастоеўскай сярэдняй школы Іванаўскага раёна Наталлі Пятроўне Маеўскай.

В. ВАЛОДЗІН,
Н. КАРПУЧЭНКА.

КАНЦЭРТЫ У КАЛГАСАХ

Студэнты Беларускага дзяржаўнага тэатральнага інстытута разгарнулі шырокую падрыхтоўчую работу да дня выбараў. Студэнты акцёрскага факультэта ў падшэфным калгасе імя Крупскай правялі рад гутарак, выступілі з канцэртам. Студэнты мастацкага факультэта дапамаглі прыгожа аформіць агітпункт калгаса.

За апошнія дні інстытутам быў арганізаваны рад выязных канцэртаў для выбаршчыкаў горада і вёскі. У калгасе «За ўладу Совetаў» быў праведзены сумесны канцэрт з удзелам студэнтаў інстытута і кансерваторыі.

27 лютага група студэнтаў старшых курсаў у складзе 16 чалавек вышла ў традыцыйны лыжны агітпрабег, прысвечаны выбарам у Вярхоўны Совет СССР. Агітбрыгада наведала некаторыя калгасы Заслаўскага раёна. Студэнты правялі рад гутарак аб Канстытуцыі СССР, азнаёмілі калгаснікаў з Палажэннем аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР і далі два канцэрты.

С. БІРУКОЎ.

На ўздыме

Да дэкады літоўскай літаратуры і мастацтва ў Маскве

У вялікай і надзвычай багатай многанацыянальнай совецкай літаратуры літоўская совецкая літаратура — адна з самых маладых. Толькі ў 1940 годзе, з устанаўленнем совецкага ладу ў Літве, стварыліся ўмовы для яе росту, станаўлення і развіцця.

Аднак яна ўзнікла не на пустым месцы. Дэмакратычныя традыцыі лепшых літоўскіх пісьменнікаў мінулага, крытычнае і рэалістычнае адлюстраванне жыцця, узоры рускай класічнай і совецкай літаратуры — вось што спрыяла ўзнікненню літоўскай совецкай літаратуры, яе далейшаму росту і развіццю. З самых першых дзён вызвалення Саламея Нерыс, Вітаутас Монтвіла, Людас Гіра сваімі натхнёнымі паэмамі і вершамі раскрылі сэнс новага, совецкага жыцця, загаварылі на поўны голас і ад усяго сэрца.

Яшчэ больш літоўская совецкая паэзія вырасла і ў ідэйных і ў мастацкіх адносінах у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Калі ў 1944 г. Совецкая Армія вызвалі ла Літву і ўсе літоўскія пісьменнікі зноў згуртаваліся ў адзіную творчую арганізацыю, пачала расці і развівацца не толькі паэзія, але і іншыя літаратурныя жанры.

Лепшыя творы Пятраса Цвіркі, перакладзеныя на рускую мову і мовы іншых совецкіх народаў, сталі здабыткам шматмільённага чытача і ў нас і за межамі Совецкай краіны. Раман «Франк Крук», які выкрывае славуты «амерыканскі лад жыцця», стаў вострай ідэалагічнай зброяй у руках многіх мільёнаў совецкіх людзей.

На пасляваенным этапе развіцця літоўскай совецкай літаратуры вялікае значэнне маюць гістарычныя рашэнні ЦК КПСС па ідэалагічных пытаннях, пастаянная дапамога, якую аказвае партыя совецкім пісьменнікам ў пераадоленні перажыткаў буржуазнай ідэалогіі.

Важным стымулам для далейшага развіцця і росту творчых сіл літоўскіх совецкіх пісьменнікаў была дэкада літоўскай літаратуры, якая адбылася ў пачатку 1948 года ў Маскве.

Хуткімі тэмпамі стала развівацца проза, якая адставала ў першыя гады совецкага ладу і ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны.

Александрас Гудайціс-Гузявічус напісаў раман «Праўда каваля Ігнотаса», удастоены Сталінскай прэміі. Пісьменнік у гэтым творы намаляваў рэалістычную карціну барацьбы літоўскага народа ў 1918—1919 гадах за ўстанаўленне совецкага ладу ў Літве.

Пазней аўтар «Праўды каваля Ігнотаса» стварыў другую частку задуманай ім эпапеі — раман «Браты», у якім паказаны перыяд барацьбы маладой Літоўскай Совецкай рэспублікі супраць замежных імперыялістаў і літоўскай буржуазіі.

Выдатнае месца ў літоўскай совецкай прозе займае раман Антанаса Венуоліса «Двор Пуаджунасаў». У гэтым творы таленавіты літоўскі пісьменнік паказаў распад і загніванне літоўскай буржуазіі ва умовах нацыяналістычнага фашысцкага ладу. Разам з тым пісьменнік адлюстраваў рост і згуртаванасць народных рэвалюцыйных сіл пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі Літвы.

Аўтар некалькіх буйных раманаў з жыцця сялян Ева Сіманайцітэ напісала новы раман «Пікчурненэ», у якім зноў звяртаецца да добра вядомых ёй людзей літоўскага прымор'я. Імя галоўнай гераіні рамана Пікчурненэ стала імем назоўным для кулацкай бесчалавечнасці, прагнасці.

У буйным творы «Вялікія падзеі ў Науямесціце» пісьменнік Понас Давідайціс, першы ва ўсёй літоўскай совецкай літаратуры, паспрабаваў адлюстраваць пасляваеннае жыццё Совецкай Літвы. На фоне пасляваеннага будаўніцтва рэспублікі, аднаўлення яе прамысловасці, аўтар паказвае сілу партыйнага кіраўніцтва, самаадданую працу рабочых, развіццё рэвалюцыйнай свядомасці інтэлігенцыі. Давідайціс выкрывае і бічуе вырадкаў літоўскага народа — буржуазных нацыяналістаў, што спрабуюць усяляк перашкаджаць соцыялістычнаму будаўніцтву.

Прадстаўнік маладога пакалення празаікаў Йонас Авіжус, які прышоў у літаратуру пасля вайны, адным з першых зацікавіўся жыццём калгаснай вёскі і адлюстраваў яго ў радзе аповесцей і апавяданняў.

Вялікі крок уперад зрабіла пасля вайны і літоўская совецкая паэзія.

Буйнейшым дасягненнем нашай паэзіі з'явілася паэма Тэафіліса Тыльвіціса «На зямлі літоўскай», удастоеная Сталінскай прэміі. У гэтым творы паэт адлюстраваў барацьбу літоўскага народа, у прыватнасці, працоўнага сялянства, за светлую будучыню, паказаў перамогу калгаснага ладу ў Літве. Востра і з вялікім мастацкім майстэрствам аўтар выкрывае ворагаў народа: кулакоў, ксяндзоў, спекулянтаў, буржуазных нацыяналістаў. У канцы 1953 года паэт выдаў новы зборнік вершаў «На палях радзімы», у якім многа твораў прысвечана вялікай Совецкай Радзіме, несакрушальнай дружбе брацкіх народаў. Тыльвіціс пераклаў на літоўскую мову нямала твораў Маякоўскага і іншых рускіх паэтаў.

Антанас Венцлава, літаратурная дзейнасць якога налічвае больш 25 год, праявіў сябе ў паэзіі галоўным чынам у совецкі час. Тэматыка паэзіі Венцлавы цельмі рознастайная; многа месца ў ёй аддадзена дасягненням літоўскага народа ў мірнай стваральнай працы, дружбе совецкіх народаў, краінам народнай дэмакратыі, барацьбе за мір ва ўсім свеце, выкрыццю іншаземных імперыялістаў. За кнігу вершаў «Выбранае» Антанасу Венцлаве ў 1952 годзе была прысуджана Сталінская прэмія. Вялікую працу прарабіў Венцлава ў галіне перакладу на літоўскую мову твораў рускай літаратуры, у тым ліку такіх буйных, як «Еўгеній Онегін», «Медны коннік» і іншыя. У канцы 1953 г. паэт выдаў свой новы зборнік лірыкі «Змагацца, гарэць, дзейнічаць!», у якім асаблівае месца займае тэма дружбы совецкіх народаў.

За апошнія 2—3 гады значны ўклад у совецкую паэзію ўнёс Эдуардас Межэлайціс. Зборнік яго вершаў «Мой салавей» быў цёпла сустрэты чытачамі.

Найбольш значным творам паэта з'яўляецца «Брацкая паэма», надрукаваная ў часопісе «Пергале» ў 1953 г. Гэты буйны эпічны твор, прасякнуты глыбокім лірызмам, малюе людзей — будаўнікоў ГЭС «Дружба народаў» — рускіх, літоўцаў, латышоў і беларусаў, якіх навекі аб'ядналі ў адну дружную сям'ю Комуністычная партыя і вялікі рускі народ.

Значны ўклад зрабіў Эдуард Межэлайціс таксама ў літоўскую паэзію для дзяцей і юнацтва. Яго паэмы «Канстант музыка», «Кім быць?», «Марытэ ў піонерскім лагеры», «Твой друг» і рад іншых — найбольш удалыя творы ў літоўскай паэзіі для дзяцей.

Паэтэса Валерыя Вальсюнене напісала пасля вайны некалькі твораў. З іх асаблівую ўвагу заслугоўвае паэма «Вераніка», у якой паказана станаўленне новай калгаснай вёскі ў Совецкай Літве, роля жанчыны ў калгасным будаўніцтве.

Ваціс Рэймерыс і Владас Мазурунас — паэты-аднагодкі, якія ўпершыню выступілі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і набылі сталасць у пасляваенныя гады. Абодва паэты пішуць таксама для дзяцей. Значныя дасягненні Ваціса Рэймерыса ў галіне перакладу. Тут у першую чаргу трэба адзначыць яго таленавіты пераклад на літоўскую мову паэм Твардоўскага «Краіна Муравія» і «Васілій Тёркін».

У літоўскай совецкай паэзіі свежымі і гучнымі галасамі загаварылі паэты больш маладога пакалення: Антанас Панінас, Эугеніюс Матузявічус, Владас Грыбас, Юозас Мацявічус і самыя маладыя — Альгімантас Балтакіс, Юстас Марцінкявічус, Бронюс Мацкявічус, Паулюс Шырвіс і іншыя.

Некаторыя поспехі ёсць і ў драматургіі і літаратурнай крытыцы, хоць яны менш значныя, чым у прозе і паэзіі. У развіцці літоўскай драматургіі пасляваеннага перыяду значную ролю адыграў народны артыст СССР і пісьменнік Барысас Даўгувеціс. Яго п'есы «Новая баразна», «Заданне», камедыя «Жалдокіне» па сутнасці і паклалі пачатак літоўскай совецкай драматургіі. Вялікі поспех мела п'еса празаіка, драматурга і кінодраматурга Юозаса Балтушыса «Пяюць пеўнікі», якая ўскрывае бязмежную жорсткасць кулакоў у час буржуазнага ладу ў Літве.

Новая п'еса Балтушыса «На досвітку», пастаўленая Літоўскім дзяржаўным драматычным тэатрам, адлюстроўвае жыццё літоўскіх калгасаў, барацьбу з класавымі ворагамі.

Вялікае значэнне для развіцця літоўскай совецкай драматургіі мела таксама п'еса Александраса Гудайціса-Гузявічуса «Праўда каваля Ігнотаса», напісаная аўтарам па яго аднайменнаму раману.

Празаік і драматург Аугусцінас Грыцюс таленавіта паказаў у п'есе «Напярэдадні» выраджэнне літоўскай буржуазіі, яе касмапалітызм і поўную дэградацыю. Другая сюжэтная лінія п'есы — барацьба народа за вызваленне. У п'есе «Асколкі» Грыцюс выкрывае кулакоў і буржуазных нацыяналістаў у пасляваеннай Совецкай Літве.

Вострым выкрывальным памфлетам на брудныя махінацыі літоўскай буржуазіі і падкопы іншаземных імперыялістаў у Літве з'яўляецца п'еса Вітаутаса Сірыёс-Гіры і Александраса Славінаса «Пан Пірсан больш не вернецца».

Расце і развіваецца ў літоўскай совецкай літаратуры новы жанр — кінодраматургія. Пісьменнік Юозас Балтушыс першым з літоўскіх пісьменнікаў уступіў на гэты шлях. Па яго сцэнарыю ў саўтарстве з кінодраматургам Е. Габрыловічам пастаўлены мастацкі каляровы фільм «Світанне над Нёманам».

У рабоце літоўскіх совецкіх пісьменнікаў ёсць значныя дасягненні, але яшчэ большыя задачы стаяць упераадзе.

Дырэктывы XIX з'езда Комуністычнай партыі Совецкага Саюза, рашэнні партыі і ўрада, накіраваныя на поўнае задавальненне растучых матэрыяльных і культурных запатрабаванняў совецкіх людзей, паставілі перад совецкай літаратурай новыя важныя задачы.

Пастаянна растучыя маладыя сілы і актыўнасць пісьменнікаў старэйшага пакалення служаць зарукай таму, што пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі літоўская совецкая літаратура ўзнімецца на яшчэ больш высокую ступень свайго развіцця, узбагаціцца новымі каштоўнымі творамі.

Йонас ШЫМКУС,
старшыня праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў Літвы.

У палоне схемы

Янка КАЗЕКА

Макар Паслядовіч больш за дваццаць год працуе ў літаратуры, і яго творы добра вядомы беларускаму чытачу. Але да апошняга часу, калі не лічыць невялікіх рэцэнзій, не было ніводнай крытычнай працы, у якой давалася-б грунтоўная ацэнка творчасці гэтага пісьменніка, раскрываліся яе асаблівасці. Патрэба ў такой працы адчувалася даўно. Вось чаму, атрымаўшы студзеньскі нумар часопіса «Полымя», чытачы не маглі не звярнуць увагі на вялікі артыкул крытыка Ул. Карпава «Проза Макара Паслядовіча».

На жаль, артыкул не можа задаволіць чытача. У ім няма ні правільнай ацэнкі творчасці пісьменніка, ні вызначэння яго месца ў агульным літаратурным працэсе, ні аналізу творчага майстэрства і мастацкіх сродкаў літаратара.

Здарылася гэта таму, што крытык ішоў не ад жывога літаратурнага працэсу, а ад прыдуманай схемы, у якую імкнуўся ўціснуць творчасць М. Паслядовіча і ўсё развіццё беларускай прозы.

Літаратурны працэс разглядаецца ў артыкуле адарвана ад жыцця, як нейкая самастойная з'ява, якая развіваецца незалежна ад часу, змен і зрухаў у грамадстве. Развіццё беларускай прозы з канца 20-х гадоў да сённяшняга дня паказана крытыкам у выглядзе змены асобных замкнутых перыядаў, кожны з якіх завяршаецца адным пэўным творам. Завяршыць асобны перыяд развіцця літаратуры, на думку аўтара, можа толькі такі твор, які пераадолее недахопы папярэдніх твораў і возьме ад іх усё моцнае і лепшае. Творчы шлях пісьменніка ўяўляецца крытыку ў выглядзе самастойнага, нязвязанага з агульным развіццём літаратуры шляху перамагання недахопаў ранняй творчасці і механічнага пераймання лепшых здабыткаў усёй літаратуры.

Вось чаму ў поле зроку аўтара артыкула не трапілі сапраўдны шлях росту беларускай літаратуры і тое істотнае, чым узбагаціў яе М. Паслядовіч. Пры аналізе твораў пісьменніка крытык менш за ўсё займаўся высвятленнем таго, наколькі глыбока змог літаратар пранікнуць у рэчаіснасць, якія тыповыя з'явы і жыццёвыя канфлікты адлюстраваў ён. Зыходзячы з таго, што ў ранніх творах М. Паслядовіча выразна адчуваўся нахіл да натуралізма, крытык галоўным чынам цікавіўся, наколькі паспяхова пісьменнік перамагаў элементы натуралізма і фактаграфічнасць; наколькі паспяхова наследваў ён майстэрства іншых пісьменнікаў.

Ад артыкула застаецца ўражанне, быццам у ім характарызуецца не творчы шлях М. Паслядовіча, а прыдуманы крытыкам нейкі механічны шлях перамагання натуралізма і пераймання творчых здабыткаў іншых пісьменнікаў. Гэтае ўражанне не змяняецца ад пахвал у адрас М. Паслядовіча і высокіх ацэнак яго мастацкіх дасягненняў, на якія не паскупіўся крытык.

Ва ўступе, адказваючы на пытанне, што-ж вызначае творчую сталасць М. Паслядовіча, Ул. Карпаў піша: «Яе глыбокая праўдзівасць і амаль дакументальная дакладнасць у лепшым сэнсе гэтага слова. Найбольш спелыя творы М. Паслядовіча з'яўляюцца яскравым сведчаннем свайго часу, працэсаў, зрухаў і змен, якія адбываліся ў жыцці. Іншы раз здаецца, што дзеля захавання жыццёвай дакладнасці пісьменнік нават не дае асаблівай волі творчаму вымыслу...» (стар. 114).

Ужо тут, у гэтай самай агульнай характарыстыцы творчасці М. Паслядовіча, якая, дарэчы, не выяўляе ніводнай сапраўднай спецыфічнай яе рысы, крытык асабліва падкрэслівае, як самае станоўчае, імкненне пісьменніка захаваць у творы «дакументальную дакладнасць», адмовіцца ад свайго права на вымысел. Калі верыць Ул. Карпаву, М. Паслядовіч быццам-бы не творча асэнсоўвае і абагульняе з'явы жыцця, не пранікае ў іх сутнасць, а неяк па-нявольніцку капіруе іх. Прычым, гэта стасуецца не толькі да ранніх, мастацкі яшчэ недасканалых твораў (першыя аповесці М. Паслядовіча «Марсель» і «Хада ў заўтра» Ул. Карпаў наогул лічыць не мастацкімі творамі, а нейкімі «дакументамі мастацкай творчасці»), але і да рамана «Святло над Ліпскам», які, па справядліваму сцверджанню крытыка, з'яўляецца вышэйшым мастацкім дасягненнем пісьменніка.

Вось што напісана ў артыкуле: «Пільна прыглядаецца пісьменнік да свайго героя (Дзяміда Сыча. — **Я. К.**) і як толькі заўважае якую-небудзь новую псіхалагічную рысу, асаблівасць, звычку, ніколі не праміне занатаваць яе» (стар. 131). «Не менш пільна прыслухоўваецца пісьменнік і да размоў навакольных аб сваім героі і гэтак-жа старанна занатоўвае іх» (тамжа). Калі-б гэтак было на самай справе, дык М. Паслядовіча наогул нельга лічыць пісьменнікам, бо так робіць не мастак-творца, а капіроўшчык.

У самым пачатку артыкула, аналізуючы аповесць «Марсель», Ул. Карпаў піша: «Макар Паслядовіч насыціў твор фактамі, узятымі з тагачаснай рэчаіснасці. Але факты тут нанізаны адзін на адзін, слаба арганізаваны, не падпарадкаваны адзінай мастацкай мэце. Падаюцца яны часта аголенымі, з надзеяй на сілу факта самога па сабе, і таму губяць сваю жыццёвую праўду. Да таго-ж, непрыемна ўражае той натуралістычны план, у якім падаюцца прадметы, з'явы, малююцца пачуцці дзейных асоб» (стар. 115).

Крытык сцвярджае, што ў той час (канец 20-х — пачатак 30-х гадоў) аголенасць вобразаў, прыземленасць і скаванасць аўтарскай фантазіі, нахіл да натуралізма і іншыя цяжкія грахі былі ўласцівы не толькі М. Паслядовічу, але і З. Бядулю, К. Чорнаму, М. Лынькову і інш. Разглядаючы апавяданні М. Паслядовіча з кнігі «Чатырнаццаты нумар», ён усю тагачасную беларускую прозу назваў прозай натуралізма, выкрасліў з літаратуры. Незразумела, як мог даследчык не заўважыць, скажам, такія глыбока рэалістычныя творы беларускай прозы, як «На прасторах жыцця» і «Дрыгва» Я. Коласа, «Салавей» З. Бядулі, «Бацькаўшчына» К. Чорнага, многія апавяданні М. Лынькова і іншыя? Калі-б ён аналізаваў іх не паводле надуманай схемы, а як жывы літаратурны працэс пачатку 30-х гадоў, дык заўважыў-бы станаўленне рэалізма ў беларускай прозе.

У першых творах М. Паслядовіча выразна праявілася схільнасць да натуралізма. Гэты недахоп, па сцверджанню крытыка, аўтар паспяхова пераадольваў у рамане «Паўстанне» і аповесці «Магістральны канал». Чаго-ж ён дасягнуў у апошніх сваіх творах—аповесці «Цёплае дыханне» і рамане «Святло над Ліпскам»? Аказваецца, і тут (у «Святле над Ліпскам»): «Пісьменнік любіць нагнятаць факты, падзеі, часта злоўжывае пералічэннямі, нагрувашчваючы факт на факт, падзею на падзею. Яго мала турбуе плыннасць у падачы падзей і, калі можна так сказаць, жывапісанне (ад слова «жывапісаць»)» (стар. 134). Чым-жа, у такім выпадку, «Святло над Ліпскам» адрозніваецца ад «Марселя»? Дзе-ж тады творчы рост М. Паслядовіча? Дзе «трывалыя здабыткі» пісьменніка і яго «выразная лінія росту»?

Мёртвая схема перашкодзіла крытыку ўбачыць і прасачыць сапраўдны творчы рост М. Паслядовіча; убачыць праўдзівае адлюстраванне савецкай рэчаіснасці не толькі ў апошніх творах пісьменніка, але і ў лепшых ранніх апавяданнях і аповесцях. Калі-б не гэтая схема, аўтар артыкула заўважыў-бы, што нават аповесці «Марсель» і «Хада ў заўтра», нягледзячы на мастацкую недасканаласць, — не нейкія «дакументы мастацкай творчасці», а творы, што адлюстравалі пэўныя істотныя з'явы свайго часу. Крытык адчуў-бы непарыўную сувязь М. Паслядовіча з савецкай рэчаіснасцю, праўду жыцця ў апавяданнях са зборніка «Чатырнаццаты нумар». І не спатрэбіліся-б тады разважанні аб тым, якая вучоба больш плённая — ў аднаго пэўнага пісьменніка ці ў многіх розных пісьменнікаў.

Па думцы Ул. Карпава, М. Паслядовіч пераймаў ад многіх і розных пісьменнікаў. Са здзіўленнем прыходзіцца чытаць на старонцы 119, што ў рамане «Паўстанне» ўвага да сюжэта «падказана» М. Паслядовічу творчай практыкай Э. Самуйлёнка; што гратэскавыя фігуры «міністраў», «прэзідэнтаў» і «галоўных дарадцаў» т. зв. Беларускай рады з'яўляюцца толькі «двайнікамі» «міністраў», «маршалкаў» і «прэм'ераў» з рамана «Язэп Крушынскі» З. Бядулі; што ў юнаках, якіх жаўнеры прымусілі ехаць у абоз, «без асаблівых цяжкасцей пазнаюцца падлеткі з ранніх апавяданняў К. Чорнага». І гэта яшчэ не ўсё. Супаставіўшы два-тры радкі К. Чорнага і М. Паслядовіча, аўтар артыкула «даводзіць», што ў рамане «Паўстанне» «ад Чорнага ідзе не толькі характар успрыняцця навакольнага чалавекам, у якога ўзрушанасць перайшла ва ўтрапенне, але і сам лад мовы, яе рытм». Гэтак-жа лёгкаверна крытык піша, што «ад Бядулі тут ідзе не толькі той сарказм, з якім падаюцца непадзяліўшыя «славы» здраднікі, але і самыя прыёмы індывідуалізацыі персанажаў, самі моўныя сродкі». Шкада, што крытык, разглядаючы «Паўстанне», так і не высветліў, што-ж ёсць у рамане ад самога М. Паслядовіча.

Калі верыць Ул. Карпаву, толькі з прыходам у літаратуру Э. Самуйлёнка беларуская проза стала «чытабельнай», і М. Паслядовіч, жадаючы зрабіць свае творы таксама «чытабельнымі», пайшоў «следам за Э. Самуйлёнкам». Без асаблівых цяжкасцей у артыкуле сцвярджаецца яшчэ адно адкрыццё: быццам-бы пад пяром А. Стаховіча ў аповесці «Пампей Шчупак» упершыню ў беларускай прозе «нарадзіўся характар», і значыць, М. Паслядовіч у стварэнні характараў сваіх герояў ідзе следам і за А. Стаховічам.

Развіваючы думкі адносна таго, якая творчая вучоба з'яўляецца больш пленнай, крытык піша: «Як эпапея «Векапомныя дні» М. Лынькова, увабраўшы ў сябе творчы вопыт папярэдняга перыяду літаратурнага развіцця, як-бы завяршае яго сабою, так і раман «Святло над Ліпскам» М. Паслядовіча, пераадолеўшы недахопы многіх папярэдніх твораў і ўзяўшы ад іх моцнае, лепшае, завяршыў сабою цэлы цыкл твораў, прысвечаных паказу аднаўлення разбуранай вайною вёскі» (стар. 130).

Выходзіць, што пасля «Векапомных дзён» можна яшчэ сяк-так рухацца наперад, бо гэты раман завяршыў толькі папярэдні перыяд літаратурнага развіцця. Што-ж датычыць тэмы аднаўлення разбуранай вайною вёскі, дык да яе нікому з пісьменнікаў не трэба будзе больш звяртацца: раман «Святло над Ліпскам» ужо завяршыў цыкл твораў, прысвечаных гэтай тэме.

Вось і паспрабуй цяпер звесці канцы з канцамі. З аднаго боку, у рамане «Святло над Ліпскам» М. Паслядовіч яшчэ не пераадолеў да канца недахопы сваёй ранняй творчасці — фактаграфічнасць і натуралізм, а з другога боку, — гэта такая мастацкая вяршыня, якую ніхто і ніколі не зможа перасягнуць.

На думку крытыка, М. Паслядовіч «узяў» ад папярэдніх твораў усё моцнае, лепшае. Але аўтар артыкула палічыў, што гэтага было недастаткова для таго, каб напісаць добры, хвалюючы твор, і пісьменніку давялося яшчэ «наследаваць» здабыткі «Яснага берага» В. Панэвай (у Карпава чамусьці «Высокага берага». — **Я. К.**), «Кавалера Залатой Звязды» С. Бабаеўскага і «Жніва» Г. Нікалаевай. Хочаш не хочаш, а трэба паверыць у цуда: М. Паслядовіч «плённа наследаваў» нават здабыткі рамана «Жніво», які быў надрукаваны праз год пасля «Святла над Ліпскам».

Звязаны па руках і нагах сваёй схемай, крытык не мог зразумець агульнасці пасобных матываў у такіх розных па характару творах, як «Святло над Ліпскам», «Ясны бераг», «Кавалер Залатой Звязды» і «Жніво», якая тлумачыцца не якімісьці наследаваннямі, а тым, што кнігі гэтыя пісаліся прыкладна ў адзін і той-жа час і адлюстроўвалі найбольш тыповыя з'явы гэтага часу.

У мінулым годзе Ул. Карпаў рэзка крытыкаваўся рэспубліканскім друкам за суб'ектывісцкі падыход і тэарэтычную бездапаможнасць у ацэнцы літаратурных з'яў. З гэтай крытыкі ён, відаць, не зрабіў для сябе належных вывадаў. Як і ў артыкуле пра творчасць І. Шамякіна, у новай працы крытыка даюць сябе адчуваць суб'ектывісцкія ацэнкі і тэарэтычная непадрыхтаванасць аўтара, цяга яго да штучнасці і манернасці. Крытык аказаўся няздольным правільна ацаніць творчасць М. Паслядовіча, разгледзець яе станоўчыя якасці і недахопы. З гэтай-жа прычыны ён не змог даць глыбокі аналіз мастацкага майстэрства пісьменніка, выявіць спецыфіку яго творчасці і абмежаваўся толькі агульнымі, невыразнымі заўвагамі адносна сюжэта, мовы, стылю твораў, накшталт наступнай заўвагі: «Значна багацейшай і больш дакладнай стала мова пісьменніка, яе маляўнічыя і лексічныя сродкі, яе сінтаксічныя пабудаванні».

Напісаны артыкул вычварна, напышліва, з яўнай прэтэнзіяй на арыгінальнасць. Адчуваецца, што Ул. Карпаву хочацца пакрасавацца перад чытачом. Ён, напрыклад, прыводзіць удалую мясціну з твора М. Паслядовіча, робіць сціплую заўвагу, што гэта «настраёвы, авеяны харошым пачуццём пейзаж», а пасля сам на працягу поўстаронкі малюе гэты-ж пейзаж. Глядзі, чытач, і вырашай, хто з нас лепш напісаў — я ці М. Паслядовіч. Аўтару наогул нельга адмовіць у сціпласці: ён паспяшыў паведаміць, што артыкул з'яўляецца ўрыўкам з ненадрукаванай і нікому не вядомай кнігі «На ўздыме». А можа гэта спатрэбілася для таго, каб у чытача засталося менш здзіўлення, бо ў артыкуле часта сустракаюцца заўвагі «як мы бачылі», «як мы гаварылі», а нічога гэтага чытач не ўбачыў, яно існуе дзесьці па-за артыкулам.

Ул. Карпаў не адзін раз раіў пісьменнікам глыбей вывучаць жыццё, пранікаць у яго сутнасць. Час, нарэшце, самому крытыку адмовіцца ад схемы і па-сапраўднаму вывучаць жыццё і літаратуру.

На тэмы дня

Шчыльней сувязь з тэатрам

Выхаванню маладых акцёраў у Тэатральным інстытуце не аддаецца належнай увагі. Моладзь інстытута выхоўваецца ў поўнай адарванасці ад тэатра, ад жыцця сцэны. Вельмі добра, што вядучы прадмет у інстытуце — майстэрства акцёра—выкладаюць такія майстры, як К. Саннікаў, Д. Арлоў, І. Ждановіч, Л. Мазалеўская, Е. Маркава. Але дрэнна тое, што ўсе этапы станаўлення маладога акцёра абмежаваны сценамі інстытута. Ён толькі два-тры разы ў час свайго навучання мае магчымасць выступіць перад гледачом на прафесійнай сцэне. Але гэтага мала, і малады акцёр, які толькі што скончыў інстытут, адчувае сябе бездапаможным у тэатры.

Інстытут адарваны ад прафесійнага тэатра. Акрамя прагляду новых спектакляў, больш ніякай сувязі з тэатрам у студэнтаў інстытута няма. Між тым, будучаму акцёру вельмі карысна было-б яшчэ са студэнцкіх год знаёміцца з тэатрам, уваходзіць у яго жыццё. Думаецца таксама, што і тэатрам, асабліва пры пастаноўцы вялікіх спектакляў, дзе патрэбны людзі для масавых сцэн, карысна памятаць аб тэатральнай моладзі і выкарыстоўваць яе.

Зусім недаравальна, што калектывы тэатраў не цікавяцца творчым ростам і станаўленнем будучай змены. Не хочацца нават думаць, што такія майстры беларускай сцэны, як Г. Глебаў, Б. Платонаў, П. Малчанаў, Л. Рахленка, У. Дзядзюшка, В. Пола, і рад іншых зусім забыліся пра існаванне інстытута. Але факт застаецца фактам, што вось ужо трэці год па розных прычынах адкладваецца сустрэча студэнтаў з артыстамі Г. Глебавым і Б. Платонавым, і невядома нават калі яна адбудзецца. Іншыя інстытуты маюць магчымасць арганізоўваць такія сустрэчы, а вось тэатральны чамусьці не можа. Вельмі прыкра, што ў нядаўнім абмеркаванні ў інстытуце спектакля «Выбачайце, калі ласка!» не прысутнічаў ні адзін выканаўца ролі, акрамя пастаноўшчыка К. Саннікава і рэжысёра Л. Мазалеўскай — педагогаў інстытута.

Студэнцкі калектыў інстытута ўдзячны народнай артыстцы БССР І. Ждановіч за яе прыхільнасць і ўвагу да выхавання тэатральнай моладзі.

Калі з тэатрам імя Янкі Купалы яшчэ ёсць некаторая сувязь праз кіраўнікоў вядучых дысцыплін у інстытуце, дык пра Рускі драматычны тэатр гэтага сказаць нельга. Такія майстры, як А. Абуховіч, А. Кістаў, Г. Качаткоў, і рад іншых мала цікавяцца моладдзю, а між тым, у гэтым тэатры працуюць выпускнікі інстытута. Недаравальна, што і маладыя акцёры, якія зусім яшчэ нядаўна скончылі інстытут, таксама занядбалі яго. А дырэкцыя інстытута да гэтага часу не арганізавала сустрэчы выпускнікоў са студэнтамі.

Маладая артыстка Л. Драздова з дня выпуску ні разу не наведала інстытут. Рэдкімі гасцямі ў інстытуце з'яўляюцца таксама былыя яго выхаванцы Ю. Галкін, К. Сянкевіч, М. Громава, І. Лапцінскі. Калі гэта яшчэ можна дараваць маладым акцёрам Віцебскага, Пінскага тэатраў, дык нельга дараваць артыстам мінскіх тэатраў, якія маюць магчымасць у любы час наведаць інстытут.

С. ПЯТРОВІЧ,
студэнт Беларускага дзяржаўнага тэатральнага інстытута.

Творы Т. Г. Шэўчэнкі на беларускай мове

Творы вялікага ўкраінскага песняра заўсёды карысталіся любоўю і шырокай папулярнасцю на Беларусі. Яшчэ ў дарэвалюцыйны час перадавыя дзеячы беларускай культуры пачалі работу па перакладах і прапагандзе шэўчэнкаўскай творчасці. Адным з першых буйных твораў паэта, перакладзеных на беларускую мову, была паэма «Кацярына», якая была надрукавана ў 1911 годзе пад рэдакцыяй Я. Купалы. У савецкі час творы Т. Г. Шэўчэнкі на беларускай мове выдаваліся неаднаразова вялікімі тыражамі. У 1939 годзе вышаў пад рэдакцыяй Я. Купалы і Я. Коласа шэўчэнкаўскі «Кабзар». Асноўныя пераклады зроблены Купалам і Коласам. «Кабзар» быў перавыдадзены і ў пасляваенныя гады з захаваннем купалаўскай і коласаўскай рэдакцыі. Асобным выданнем у 1940 годзе выдадзена на беларускай мове паэма «Наймічка». Па рэдакцыі дзіцячай літаратуры ў 1941 годзе вышлі «Выбраныя творы» Т. Г. Шэўчэнкі.

У 1939 г. Акадэміяй навук БССР быў выдадзены біяграфічны нарыс аб вялікім украінскім песняру, а таксама бібліяграфічны даведнік па яго творах.

У тым-жа годзе вышаў зборнік «У вянок Т. Г. Шэўчэнкі», у які ўвайшлі артыкулы і мастацкія творы Я. Купалы, Я. Коласа, З. Бядулі, П. Броўкі, М. Лынькова, М. Клімковіча і іншых, прысвечаныя вялікаму паэту.

У пасляваенныя гады, акрамя «Кабзара», вышлі выбраныя вершы і паэмы Т. Г. Шэўчэнкі ў перакладах Я. Купалы, Я. Коласа і З. Бядулі з артыкулам М. Багдановіча «Памяці Т. Г. Шэўчэнкі». У зборнік увайшла значная колькасць вершаў, а таксама сем паэм.

Наладзіць выраб графічнага багету

У некаторых дамах Мінска вісяць на сценах старыя фатаграфіі і літаграфіі ў вузкіх просценькіх рамках, нярэдка з пазалочанымі беражкамі, зробленыя з так званага графічнага багету. Такія рамкі калісьці шырока ўжываліся, аднак у апошні час іх чамусьці зусім няма ў продажы. Аб гэтым можна толькі пашкадаваць. Графічны багет неабходны для ўсякіх афарміцельскіх работ, пачынаючы з аправы маленькіх «аматарскіх» фатаграфій і канчаючы разнастайнымі матэрыяламі ў экспазіцыях музеяў і на выстаўках.

У нас, на Беларусі, ёсць даволі магчымасцей масавага вырабу розных відаў графічнага багету для ўласных патрэб і для збыту за межамі рэспублікі.

На жаль, да гэтага часу ніхто ў нас не аддае належнай увагі даўно наспеўшаму пытанню аб вытворчасці багету на месцы.

Трэба, каб у першую чаргу гэтым заняліся Міністэрства культуры БССР і Саюз савецкіх мастакоў БССР, як арганізацыі найбольш у гэтай справе зацікаўленыя.

А. МАРТЫНАЎ.

ТРЫБУНА ПІСЬМЕННІКА

За паэзію вялікага грамадскага гучання

★

Алесь КУЧАР

★

У нас цяпер шмат гавораць і пішуць пра тое, што ўзровень паэзіі не задавальняе чытача. У прыватнасці, гэта сцверджанне мы знаходзім і ў многіх артыкулах, надрукаваных у газеце «Літаратура і мастацтва» ў парадку дыскусіі па пытаннях паэзіі.

Залішне шмат рыторыкі, няма глыбокага раскрыцця думак і настрояў савецкага чалавека — будаўніка комунізма, — гаворыцца ў некаторых з гэтых артыкулаў.

Паэзія наша не задавальняе чытача. Гэта правільна. Але правільна і тое, што не толькі «понимание», але і пісанне вершаў «выше довоенной нормы». Майстэрства нашых паэтаў, безумоўна, узрасло. Гэта выразна відаць, калі прагледзець паэтычную прадукцыю беларускіх паэтаў за 1953 год.

Мы, па-першае, тут маем незвычайную шырыню тэматыкі, адлюстроўваецца жыццё нашага народа ва ўсіх яго праявах. Многія творы прысвечаны ўслаўленню велічы партыі комуністаў, гістарычным падзеям у нашай краіне, мінуламу Радзімы. З'явіўся рад твораў аб каханні, аб яго жыватворчай сіле, аб тым, як яно натхняе савецкіх людзей у іх працы і жыцці.

Усё яшчэ мала твораў, прысвечаных галоўнаму, чым жыве наша краіна, — складанейшым і цікавейшым працэсам, якія адбываюцца на вёсцы. І ў гэтым нашы паэты ў вялікім даўгу перад Радзімай. Яны павінны зрабіць усе вывады з гістарычных рашэнняў вераснёўскага Пленума ЦК КПСС.

У мінулым годзе апублікаваны паэмы— А. Куляшова «Граніца» і А. Бялевіча «Родная крыніца», значная колькасць вершаў. Сярод вершаў вылучаюцца «Паэт і крыніца» П. Броўкі, «Ідуць камбайны», «Таварышу», «Светлячок» М. Танка, «Мора сініх ільноў» М. Лужаніна, «Казка пра [illegible]аваля» А. Зарыцкага, «Чырвонагвардзеец», «Змаганне ідзе за жыццё» А. Русецкага, «Ноч над Іспаніяй» Р. Няхая, прачулыя вершы П. Панчанкі, прысвечаныя памяці І. В. Сталіна, вершы К. Кірэенкі, А. Бялевіча, А. Вялюгіна, Д. Кавалёва, напісаныя ў дні ўсенароднай жалобы. Паспяхова працаваў у мінулым годзе малады паэт П. Макаль. Некалькі ўдалых вершаў апублікавалі В. Матэвушаў, маладыя паэты А. Вольскі, А. Лойка і інш. Ул. Корбан напісаў рад удалых баек.

Але ўсё яшчэ друкуецца шмат вершаў, дзе пераважае рыторыка, агульшчына, адсутнічае глыбокі змест, яны вельмі слабыя па форме. Часта гэта творы на надзённыя тэмы жыцця нашай краіны. Але ў іх няма глыбокага раскрыцця дум і пачуццяў савецкага чалавека, а ёсць толькі павярхоўная канстатацыя фактаў. Да таго-ж адсутнічае мастацкі вобраз, ды і мова бедная, газетная.

Антон Бялевіч піша:

Добры дзень, дарагая сталіца,
Мы не можам табой нахваліцца.

А Анатоль Астрэйка дапаўняе:

Міру, шчасця мы хочам,
К комунізму мы крочым.

Зусім зразумела, што прыведзеныя вышэй радкі выказваюць правільныя думкі, але гэтыя думкі не знайшлі канкрэтнага пачуццёвага, вобразнага адлюстравання, таму яны засталіся рытарычным воклічам.

Не толькі А. Бялевіч і А. Астрэйка, але і многія іншыя паэты грэшаць агульшчынай, рытарычнасцю, адсутнасцю яскравай думкі. У асобных з маладзейшых паэтаў з'явілася яшчэ адна хвароба — наследванне джазава-эстрадным вершам. Вось зусім малады паэт Ніл Гілевіч піша:

Для каго, куды бяжыць дарожка
Па жытнёвым полі, па лугу?
Пакахала я цябе, Алёшка,
А прызнацца ў гэтым не магу... і г. д.

Пра тое-ж ён піша і ў вершы «На трамвайным прыпынку». Яму ўторыць Марк Смагаровіч у вершы «Мой таварыш». Штосьці падобнае пэпча і П. Прануза ў вершы «Пра Зосю».

У падобных вершах, напісаных на так званую тэму «інтымных пачуццяў», людзі выступаюць лёгкадумнымі, інтэлектуальна абмежаванымі, сіроп і патака густа плавае вакол іх.

Выступаючы супраць падобных твораў, мы зусім не адмаўляем лірыку інтымных пачуццяў. Напісаў-жа той-жа П. Прануза добры верш пра дзяўчыну — «Толькі-б ты адпачывала». У гэтым вершы ёсць такт, клопат пра сваю каханую, нейкае асаблівае хлапецкае высакародства. Такія вершы правамерны, і яны патрэбны нашай моладзі, трэба толькі засцерагацца залішняй сентыментальнасці і рамансавых настрояў.

Некаторыя паэты стараюцца штучна звязаць лірыку кахання з «вытворчымі працэсамі», і вось што атрымліваецца:

Дзяўчыне ішоў дзевятнаццаты год.
І першага сэрцам любіла,
І ад таго ў яго кожны прыход
Яна, счырванеўшы, касу церабіла.
Дзівак! Хоць на час адарваўся-б ад кніг—
Няхай-бы у вочы табе паглядзела.
Ясней стаў-бы ўнутраны рухавік,
Званчэй-бы машына твая загудзела!

Гэта напісаў малады паэт С. Гаўрусёў.

У вершы «Паштальён» Раман Сабаленка таксама лёгкадумна паставіўся да гэтай тэмы. Ён амаль што лічыць, што каханне «не прыносіць ні дум, ні трывог». Паэт выбраў для свайго верша тэму разлукі былых студэнтаў. Яна працуе недзе далёка ў тайзе, а ён—у Беларусі. І вось як яны лёгкадумна да гэтага ставяцца:

Працуй, пішы, адлегласць не бяда,
Яна не перашкода для кахання.

Шмат у нас у апошнія часы пішацца баек, але не ўсе яны адпавядаюць патрабаванням жанра. Хаця Ул. Корбан і напісаў некалькі нядрэнных баек, але, чытаючы некаторыя з іх, узнікае законнае пытанне: прычым тут львы, дзікі, мядзведзі, чаму нельга было проста назваць тых людзей, пра якіх ідзе гаворка?

Вось байка Ул. Корбана «Леў». Усім вядома гісторыя, якая адбылася ў Бабруйску. Пра яе пісалі і ў газетах. Жулікі, скарыстаўшы разявацтва некаторых гаспадарнікаў, «узялі» з банка шмат тысяч грошай. І былі ў гэтым вінаваты канкрэтныя людзі. А Ул. Корбан зашыфроўвае іх і называе «львамі». Прычым тут львы, калі ёсць канкрэтныя прозвішчы вінаватых? Тое самае трэба сказаць і пра байку «Зязюлін галасок». Чаму аўтару проста не сказаць, аб кім у вершы ідзе гаворка?

А класічная байка вучыць нас зусім іншаму. У Крылова, напрыклад, нельга адвольна замяніць звера чалавекам. У байцы «Зеркало и обезьяна» можа дзейнічаць толькі малпа, падстаўце на месца яе чалавека, і байка страціць свой абагульняючы характар, страціць сваю філасофскую і жыццёвую мудрасць. Тое самае ў байцы «Пустынник и медведь». Толькі зрабіўшы аб'ектам сваёй байкі мядзведзя, аўтар мог яскравей давесці думку, што «услужливый дурак опаснее врага».

А ў некаторых нашых байках можна спакойна замест звяроў ставіць канкрэтныя прозвішчы, бо гэта хутчэй не байкі, а фельетоны. Часамі ў гэтых вершах, названых «байкамі», уражае неарганічнасць тых персанажаў, праз якія аўтар даносіць да чытача сваю думку. Напрыклад, у байцы «Вартавы» Корбана дзейнічае двое дзяцей — Янка і Тацяна. Янку бацькі пакінулі вартаваць мёд. Ён не ўтрымаўся і пачаў ласавацца мёдам. Прышла яго сястрычка Тацяна — ён і ёй дазволіў ласавацца, бо ў яго самога рот быў замазаны мёдам. І вывад:

А ёсць яшчэ, на жаль, асобы,
Што бачаць непарадкі й не крычаць.
Бо рот замазаны ў іх. Маўчаць.

Зусім зразумела, што на вобразах дзяцей нельга было вырашыць тэму бічавання раскрадальнікаў народнага дабра. Бо дзеці, якія ласуюцца мёдам, выклікаюць толькі лёгкую і спачувальную ўсмешку, а ніяк не гнеў, чаго дамагаўся аўтар.

Такія асноўныя недахопы ў творчасці нашых маладзейшых паэтаў.

Не заўсёды задавальняе нас паэтычная прадукцыя і сталых майстроў. Тут трэба сказаць некалькі слоў пра Максіма Танка. Гэта паэт са сваім яскравым творчым абліччам, яго паэзіі ўласцівы вялікі пафас.

Прыблізна ў 1947 г. Максіму Танку ўдалося правільна вызначыць асноўны пафас сваёй пасляваеннай паэзіі. Гэты новы этап у творчасці паэта азнаменаваўся вершамі, якія потым увайшлі ў зборнік «Каб ведалі». У іх Максім Танк расказаў для будучых пакаленняў («каб ведалі») захапляючую, поўную драматызма і вялікай мужнасці гісторыю барацьбы нашага народа ў Вялікую Айчынную вайну, паказаў, як узнімаўся з руін, як ажываў родны край. Пафас мужнай узброенай барацьбы і пафас аднаўлення былі настолькі злітныя ў паэзіі Танка, што гэта парадзіла шырыню тэматыкі, цікавасць паэта да рэвалюцыйнай барацьбы многіх народаў і шмат якіх бакоў нашага жыцця. Паэт клапаціўся аб тым, каб хутчэй сагрэць і апрануць сірот, што засталіся пасля вайны, пасеяць жыта на ўзараных гонях, яшчэ вышэй узняць славу сваёй Радзімы. Не забыўся ён і на гістарычнае мінулае свайго народа. Так з'явілася цудоўная балада пра Люцыяна Таполю. Максім Танк у сваіх творах выказваў вялікае спачуванне барацьбе французскага народа, бачыў у сваім уяўленні маці бясстрашнага барацьбіта Беляніса, ён пакутваў разам з карэйскім народам. Пачуццё пролетарскага інтэрнацыяналізма, пачуццё дружбы народаў — самае каштоўнае, што ёсць у пасляваенных вершах Максіма Танка. Як яскрава ён паказвае дапамогу роднай Масквы і рускага народа Савецкай Беларусі, з якой любасцю ён шле братнія падарункі ад Беларусі ўсім народам Савецкага Саюза! Вершы Танка цэласныя, яркія, кожны з іх мае глыбокую паэтычную думку.

Аднак апошнім вершам М. Танка, асабліва вершам, надрукаваным у 1953 г., уласцівы і пэўныя слабасці. Паэт пачынае паўтарацца. Пафас у яго вершах паступова заціхае, часамі перараджаецца ў рыторыку. Вось верш «Вячэрняй парой». Аўтар піша:

Бо ведаю,
Якой была няшчаснай
Зямля мая
У дні гора, аб якіх
Сягоння ў школах
Нашы дзеці, часам,
Даведваюцца
Са старонак кніг.
І радасна, што
Гэткай яна стала
Багатаю
Ад нашых ніў, садоў,
І светлаю ад зораў,
Што заззялі,
І звонкаю
Ад песень галасоў.

Але пра гэта мы ўжо чыталі ў вершах Максіма Танка. У 1947 г. у вершы «Наша восень» ён сказаў аб гэтым значна мацней:

І глядзеў, ахмялеўшы ад радасці я,
Колькі трэба было,
Шматпакутная маці-радзіма мая,
І гаючых дажджоў,
І усходніх вятроў,
Каб у косах нявест
Нелінючыя стужкі заззялі,
Каб музыкі твае
Ды вясельныя песні зайгралі,
Ад якіх загучэла зямля!

У вершы Максіма Танка «З новым годам» зноў маем паўтор:

Шмат сустрэч у родным горадзе
З дамамі,
З стадыёнам, завадскімі
Карпусамі.
Сярод плошчы, з піонерскай
Елкай яркай,
З кожным дрэвам, што садзілі
У нашым парку.

Але гэта ўжо было. Танк ужо хацеў паціснуць рукі працавітым кранам, маторам, экскаватарам, станкам і некалькі разоў сустракаўся з дамамі і дрэвамі (глядзі

(Працяг на 4-й стар.).

Маладыя кампазітары

Калі знаёмішся з творчасцю маладых кампазітараў — студэнтаў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі — адразу заўважаецца адна важная дэталь: многія з іх твораў вызначаюцца сваім меладычным багаццем, свежасцю і непасрэднасцю пачуццяў, імкненнем прытрымлівацца выразнай формы і развіваць музычную думку. Праўда, не ва ўсіх пачынаючых кампазітараў заўсёды новыя тэмы і цікавая музычная мова.

Студэнт першага курса А. Дудзін спрабуе свае сілы ў галіне вакальнай лірыкі. Яго першыя творы — «Вязень» А. Пушкіна і «Уцёс» М. Лермантава. Форма пабудовы рамансаў, характар фартэпіяннага суправаджэння і ў некаторай ступені меладычны рысунак даюць падставу думаць, што Дудзін імкнецца наследаваць традыцыям рускага раманса. Але, калі малады кампазітар звяртаецца да совецкай лірыкі, тады мелодыя яго песні часта бывае заснавана на звыклых, усталяваных інтанацыях і зваротах, і гэта робіць яе зусім «знаёмай», нават калі слухаеш першы раз.

Такое выкарыстанне знаёмых музычных зваротаў наогул уласціва некаторай частцы нашай музычнай моладзі. Прыкладам можа быць лірычная песня студэнта М. Наско «Я шукала спакою» (словы А. Бачылы). Нельга лічыць сур'ёзным дасягненнем і раманс гэтага-ж аўтара на словы П. Глебкі «Прызнанне», які напісаны ў плане лёгкага эстраднага вальса. Між тым, асобныя рамансы М. Наско вызначаюцца арыгінальнай мелодыяй, непасрэднасцю, шчырасцю. Гэта рамансы «Цябе у сэрцы зберагу» (словы А. Астрэйкі), «Я не ведаў, хто ты» (словы М. Танка), «Першая сустрэча» (словы А. Астрэйкі), а таксама «Песня аб Леніне» (словы Я. Коласа) і раманс «Ленінскай праўды святло» (словы П. Глебкі), якія характарызуюцца строгай і велічнай мелодыяй.

Адчуваецца, што малады аўтар шукае свой адметны шлях, не вельмі добра яшчэ ўяўляючы, якім будзе яго ўласны «почырк». Аднак рысы беларускай песеннасці ўласцівы яго песням, а таксама творам для секстэта домр («Беларуская полька») і для сімфанічнага аркестра («Лірычная паэма»).

Студэнт І. Ронькін вядомы як аўтар рада ўдалых песень для дзяцей. Сярод іх вылучаюцца песні «Кнігам пашана і гонар», «Піонерская». Цікавыя і некаторыя яго рамансы, у прыватнасці, «Ходзіць вецер па даліне» (словы Я. Купалы).

Асобныя творы І. Ронькіна могуць ужо характарызаваць яго як кампазітара. Гэта — саната для кларнета і фартэпіяно і «Гераічная уверцюра» для сімфанічнага аркестра. Прасякнутая беларускай народнай песеннасцю, саната гучыць жыццерадасна, проста, яе прыемна слухаць. «Гераічная уверцюра» І. Ронькіна — першая і даволі ўдалая спроба маладога кампазітара ў галіне сімфанічнай музыкі, якая адлюстроўвае барацьбу беларускіх партызан у гады Вялікай Айчыннай вайны. Тут пераканальная і першая тэма, напісаная ў плане гераічнай партызанскай песні, і другая тэма — спакойная, лірычная, якая раскрывае ўнутраны свет герояў, і песня лесу ва ўступе, і жалобны эпізод, які расказвае пра смерць героя. Асноўныя вобразы ўвасоблены ў канкрэтных і яркіх музычных тэмах. Пажадана праслухаць гэты твор у выкананні сімфанічнага аркестра.

Студэнт В. Чараднічэнка піша драматычна-ўсхваляваныя фартэпіянныя творы з шырокай фантазіяй у развіцці формы. Такімі з'яўляюцца яго прэлюдыя і канцэртны эцюд. Тут выразна адчуваецца ўплыў рамантычнага стылю Рахманінава, часткова Шапэна. Але часамі сустракаецца неўласцівая рускай класічнай музыцы пагоня за вонкавымі эфектамі. Названыя творы меладычныя, маюць цікавую гарманічную мову. Гэта дае падставу меркаваць, што Чараднічэнка, звярнуўшыся да больш блізкіх яму вобразаў і тэм, здолее раскрыць іх у прыгожай, сакавітай музыцы.

Студэнт Ю. Семяняка шмат год працуе ў харавым калектыве, чым і тлумачацца яго ўдачы ў жанры вакальнай лірыкі. Першай удалай песняй яго была «Ой, шумяць лясы зялёныя». Яна захапляе сваёй шчырасцю, цеплынёй, прастатой.

Калі слухаеш вакальныя творы Семянякі, дык заўважаеш у іх адсутнасць чужых інтанацый і зваротаў. Малады кампазітар вельмі клапатліва і асцярожна выкарыстоўвае ўласцівыя сучаснай песні інтанацыі, што асабліва заўважаецца ў такіх яго песнях, як «Застольная» (словы М. Танка), жартоўная песня «Як сказалі» (словы А. Бачылы), «Дзявочая жніўная» (словы А. Яўменава), «Помніш, любы мой, дзянёчкі» (словы А. Русака), рамансы «У тваю святліцу» (словы А. Пушкіна), «Успаміны» (словы К. Кірэенкі).

Творчая смеласць—вось што характарызуе творчасць студэнта Е. Глебава. Паступіўшы ў 1950 годзе ў кансерваторыю амаль без музычнай падрыхтоўкі, ён здолеў за кароткі час авалодаць асновамі музычнай адукацыі і дасягнуў значных поспехаў. Глебаў мае здольнасці і да складаных жанраў. Побач з удалымі вакальнымі творамі яму належаць «Рондо» для скрыпкі з аркестрам, «Балада» для скрыпкі і фартэпіяно, «Фантазія» для фартэпіяно з аркестрам, саната для фартэпіяно. Асабліва вылучаецца «Балада» для скрыпкі з фартэпіяно, напісаная ў традыцыйнай трохчастковай форме. У гэтым творы выразная форма, яна па-новаму трактуецца і падаецца аўтарам. У фартэпіяннай «Фантазіі» аўтар выкарыстоўвае мелодыі двух вядомых беларускіх народных песень, розных паводле свайго характару і зместу, — «Я табун сцерагу» і «Ды ляцела сойка».

«Песня аб радзіме», «Песня славы», «Лірычная» Г. Анчыкава маюць элементы песеннага фальклору чувашскага народа. Лірычная народная чувашская тэма ў яго варыяцыях для фартэпіяно набывае розныя адценні, яна гучыць то з некаторым сумам, то строга і стрымана, а то раптам лёгка і грацыёзна, або нечакана ўзнімаецца да яркага ўрачыстага гучання. І ні на хвіліну не губляеш адчування цеплыні, прывабнасці народнай мелодыі, тонкага нацыянальнага каларыту. Гэта своеасаблівы, самастойны твор.

Е. Дзягцярык з'яўляецца аўтарам сімфоніі, у якой перададзены драматызм, усхваляванасць, а таксама яркі святочны настрой. Лірычныя тэмы сімфоніі гучаць шырока, напеўна. Кампазітар у сімфоніі часта не прытрымліваецца ўсталяваных традыцыйных схем пабудовы, а смела падыходзіць да выкарыстання музычнага матэрыялу.

Аднак маладога аўтара трэба папракнуць у тым, што ён неактыўна ўваходзіць у жыццё, і таму наша сучаснасць пакуль знаходзіць у яго творах вельмі нязначнае адлюстраванне.

Перад пачынаючымі кампазітарамі ляжыць яшчэ доўгі і цяжкі шлях да авалодвання майстэрствам. Многія творы маладых напісаны цікавай, меладычнай, але часта ненацыянальнай, нейкай агульнай музычнай мовай. Самабытнасць беларускай народнай песні павінна стаць арганічным элементам у творах розных жанраў, у раскрыцці самых рознастайных тэм і вобразаў. Нацыянальны каларыт у творах маладых кампазітараў часта вызначаецца толькі цытатным выкарыстаннем вядомых народных песень. У сувязі з гэтым паўстае пытанне, як-жа знаёмяцца студэнты кансерваторыі з песеннай і музычнай народнай творчасцю? Трэба сказаць, што гэтае знаёмства павярхоўнае: толькі на першым курсе кансерваторыі студэнтаў знаёмяць з асобнымі народнымі песнямі, пераважна дарэволюцыйнымі. Больш на працягу навучання ў кансерваторыі яны не маюць магчымасці вывучаць песенны фальклор. Ці не варта падумаць, што для студэнтаў-кампазітараў гэтага недастаткова.

Паўстае і другое пытанне: чаму ў час летніх канікул студэнты-кампазітары не пасылаюцца ў фальклорныя экспедыцыі? Да таго-ж і матэрыялы фальклорных экспедыцый Саюза кампазітараў БССР таксама застаюцца невядомымі для студэнтаў.

Гэтым і тлумачыцца скарыстанне ў некаторых творах толькі старых песень народа, а не сучасных.

Асабліва кідаецца ў вочы нацыянальны каларыт лепшых твораў самадзейных кампазітараў, якія звязаны з народнымі песеннымі калектывамі. Дарэчы, трэба адзначыць, што самадзейныя кампазітары не вельмі часта прыцягваюцца ў нас да вучобы ў кансерваторыі. Выключэнне складае толькі Ю. Семяняка.

Шмат яшчэ цяжкасцей давядзецца пераадольваць маладым кампазітарам. Трэба дасканала авалодаць формай музычнага твора, умець ярка і вобразна раскрыць тэму, без надуманага пафасу, манернічання, проста і лёгка расказаць аб цікавым, хвалюючым, умець карыстацца гарманічнай мовай так, каб надаць твору выразны каларыт. Неабходна дамагчыся таго, каб мелодыі новых твораў не здаваліся такімі «знаёмымі» нашым слухачам і не былі запазычаны ў вядомых майстроў. Гэта асабліва датычыць песень.

Некаторым з пачынаючых кампазітараў трэба больш актыўна ўваходзіць у жыццё. Ім трэба быць не толькі канстататарамі падзей, але і актыўнымі ўдзельнікамі іх.

Е. РАКАВА.

XV пленум праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў

З сакавіка ў Маскве пачаўся XV пленум праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў СССР. У канцэртнай зале імя Чайкоўскага адбылося ўрачыстае паседжанне пленума, прысвечанае 300-годдзю ўз'яднання Украіны з Расіяй з удзелам украінскіх пісьменнікаў, прадстаўнікоў пісьменніцкіх арганізацый саюзных і аўтаномных рэспублік, дзеячоў навукі і мастацтва. Пасля кароткага ўступнага слова **А. А. Суркова** даклад аб гістарычных сувязях рускай і украінскай літаратур зрабіў **М. Ф. Рыльскі.** Дакладчык гаворыць аб руска-украінскіх палітычных, эканамічных і літаратурных сувязях, якія былі ўстаноўлены яшчэ да ўз'яднання Украіны з Расіяй. Ён падкрэслівае, што Пераяслаўская Рада спрыяла ўмацаванню і пашырэнню брацкай дружбы, паглыбленню плённага ўплыву перадавой рускай культуры на культуру украінскага народа. М. Рыльскі на радзе прыкладаў паказвае вялікую цікавасць рускіх пісьменнікаў да жыцця украінскага народа.

— Руская перадавая літаратура, — гаворыць ён далей, — была школай рэалізма для украінскіх пісьменнікаў. Творы Пушкіна і Лермантава, Гогаля і Некрасава, Белінскага і Герцэна, Чэрнышэўскага і Дабралюбава, Салтыкова-Шчэдрына і Талстога, Чэхава і Караленкі адыгралі ў развіцці украінскай літаратуры і ўсёй культуры велізарную ролю.

Дакладчык характарызуе вялікі ўплыў на украінскіх пісьменнікаў творчасці М. Горкага і В. Маякоўскага.

— Комуністычная партыя, — гаворыць М. Рыльскі, — заўсёды аддавала велізарную ўвагу совецкаму будаўніцтву на Украіне, развіццю украінскай культуры і літаратуры.

У заключэнне М. Рыльскі прачытаў свой верш «Слава рускаму народу».

Затым выступіў **В. Катаеў.** Ад імя рускіх совецкіх пісьменнікаў ён перадаў брацкае прывітанне украінскім літаратарам.

— Нашы народы, — сказаў В. Катаеў, — браты па духу, у іх адна душа — славянская, вольналюбівая, гордая.

В. Катаеў абвяшчае здравіцу — за украінскіх пісьменнікаў, за ўсе брацкія народы соцыялістычнай Радзімы, за Маскву і Кіеў, за родную Комуністычную партыю, за комунізм.

Аб святкаванні 300-годдзя ўз'яднання Украіны з Расіяй у Беларусі, аб спрадвечнай дружбе беларускага народа з рускім і украінскім, аб плённым уплыве рускай і украінскай літаратур на беларускую расказаў пленуму **П. Броўка.** Сваё выступленне ён закончыў вершам аб дружбе народаў.

Ад імя пісьменнікаў і работнікаў мастацтва Літвы, што прыехалі на дэкаду ў Маскву, удзельнікаў пленума вітаў паэт **А. Венцлава.** Апладысментамі сустрэлі прысутныя рускага паэта **М. Ісакоўскага,** які прачытаў свой верш «Украіна, мая Украіна». На пленуме з прамовамі выступілі грузінскі паэт **І. Абашыдзе,** азербайджанскі паэт **С. Рустам,** казахскі пісьменнік **С. Муканаў,** таджыкскі пісьменнік **Улуг-Зода,** башкірскі паэт **М. Карым.**

Пасля ўрачыстага пасяджэння адбыўся вялікі канцэрт.

Нарада маладых літаратараў

Больш 60 пачынаючых паэтаў і празаікаў прынялі ўдзел у нарадзе маладых пісьменнікаў, якая адбылася 27—28 лютага ў Брэсце. Удзельнікі нарады праслухалі даклад кандыдата філалагічных навук А. Крайко аб задачах беларускай літаратуры ў святле рашэнняў XIX з'езда партыі і верасняўскага Пленума ЦК КПСС і даклад пісьменніка М. Клімковіча аб літаратурным майстэрстве. На секцыі паэтаў, работай якой кіравалі М. Клімковіч і А. Вялюгін, было абмеркавана больш 70 вершаў удзельнікаў нарады. Добрую ацэнку атрымалі творы настаўніка З. Вагера, журналіста Н. Чарняева, настаўніцы Н. Шалагінай, студэнта М. Шавеля, ваеннаслужачага А. Сімарына. На секцыі прозы, якой кіравалі Я. Брыль і І. Грамовіч, станоўча ацэнены апавяданні вучня Івацэвіцкай сярэдняй школы М. Купрэева. У абмеркаванні твораў актыўны ўдзел прынялі маладыя літаратары.

У заключэнне нарады выступілі Я. Брыль, А. Вялюгін, М. Клімковіч, якія заклікалі пачынаючых пісьменнікаў глыбей вывучаць жыццё, вучыцца на творах класічнай і сучаснай літаратуры, удасканальваць майстэрства.

Удзельнікі нарады праслухалі таксама справаздачны даклад старшыні літаб'яднання М. Засіма. Абраны новы склад праўлення літаб'яднання.

За час прабывання ў Брэсце пісьменнікі М. Клімковіч, Я. Брыль, А. Вялюгін, І. Грамовіч выступілі з чытаннем сваіх твораў у педінстытуце, педвучылішчы, сярэдняй школе № 1 і на адным з выбарчых участкаў. З чытаннем сваіх вершаў выступілі таксама члены Брэсцкага літаб'яднання М. Засім, Ул. Кулакоў, А. Авечкін і А. Сімарын.

В. ВОЛКАЎ.

г. Брэст.

На музычных „серадах"

На апошняй «серадзе» ў Саюзе кампазітараў БССР былі праслуханы два хоры Г. Анчыкава і пяць рамансаў Л. Абеліёвіча на словы Бернса.

Рамансы «За жытнім полем», «Ці даўно цвіў зялёны дол», «Каханне», «Песня дзяўчыны», «Пацалунак» на словы Бернса паказалі ўзросшае майстэрства кампазітара, яго добры густ і здольнасць ствараць меладычныя песні.

Добрае ўражанне пакінула «Песня славы» Г. Анчыкава для змешанага хора. Кампазітар здолеў у шырокай напеўнай мелодыі ярка і пераканальна перадаць паэтычны тэкст чувашскага пісьменніка Шумілава. Другі хор гэтага кампазітара «Партызанская слава» атрымаў адмоўную ацэнку.

Новыя творы беларускіх кампазітараў выканалі заслужаная артыстка БССР Т. Ніжнікава і харавы ансамбль.

Нельга абыйсці той факт, што кампазітары зусім не пішуць песень на важнейшыя тэмы жыцця. Няма песень на калгасную тэматыку, на тэму аб уз'яднанні Украіны з Расіяй.

Саюзу кампазітараў неабходна сур'ёзна перабудаваць сваю работу ў адпаведнасці з патрабаваннямі жыцця.

Юбілейны вечар у тэатры оперы і балета

Урачыста адсвяткавала грамадскасць рэспублікі дваццацігоддзе Беларускага дзяржаўнага ордэна Леніна Вялікага тэатра оперы і балета.

Павіншаваць творчы калектыў, вядомых майстроў вакальнага і харэаграфічнага мастацтва сабраліся стаханаўцы і інжынерна-тэхнічная інтэлігенцыя заводаў і фабрык, дзеячы культуры, навукі, літаратуры і мастацтва, афіцэры Мінскага гарнізона, студэнты вышэйшых навучальных устаноў, піонеры.

Міністр культуры БССР Г. Кісялёў адкрыў урачысты сход.

У дакладзе аб творчым шляху тэатра народная артыстка СССР Л. Александроўская пазнаёміла гасцей з тым, як за дваццаць год вырас Вялікі тэатр — цэнтр музычна-сцэнічнай культуры БССР.

З прывітаннямі ад імя Совета Міністраў БССР і ЦК КПБ выступіла намеснік старшыні Совета Міністраў БССР Е. Уралава, ад імя Мінскіх абкома і гаркома КПБ, аблвыканкома і горвыканкома — сакратар Мінскага ГК КПБ С. Саламаха.

З віншаваннямі выступілі прадстаўнікі буйнейшых прадпрыемстваў сталіцы — аўтамабільнага, шарыкападшыпнікавага і іншых заводаў.

Ад музычнай грамадскасці калектыў тэатра вітаў старшыня праўлення Саюза совецкіх кампазітараў БССР Я. Цікоцкі, ад Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР — А. Макаёнак. Калектыў тэатра віншавалі таксама намеснік міністра культуры БССР П. Лютаровіч, прадстаўнікі тэатраў: ад тэатра імя Янкі Купалы — П. Малчанаў, ад Рэспубліканскага рускага тэатра — А. Абуховіч, дырэктар Політэхнічнага інстытута М. Дарашэвіч.

З адказам на віншаванні выступіў народны артыст БССР М. Дзянісаў.

На імя тэатра атрыманы прывітальныя тэлеграмы ад ЦК ЛКСМБ, грамадскіх арганізацый і культурных устаноў БССР, ад Латвійскага, Літоўскага, Саратаўскага і Горкаўскага оперных тэатраў.

У вялікім канцэрце ўдзельнічалі старэйшыя майстры тэатра, аркестр, хор, балет і таленавітая творчая моладзь.

ПЯЦІДЗЕСЯЦІГОДДЗЕ Г. А. КАЧАТКОВА

Гэтымі днямі адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны пяцідзесяцігоддзю з дня нараджэння і трыццацігоддзю сцэнічнай дзейнасці народнага артыста БССР і Узбекскай ССР Г. А. Качаткова.

Галоўны рэжысёр Рускага дзяржаўнага драматычнага тэатра БССР В. Фёдараў расказаў аб творчым шляху артыста, майстэрства якога праявілася ў вобразах станоўчых герояў сучаснай і класічнай драматургіі і ў яркіх сатырычных характарах.

Юбіляра віталі шматлікія прадстаўнікі грамадскасці, дзеячы мастацтва і літаратуры.

У заключным слове Г. А. Качаткоў сардэчна падзякаваў гасцей за шчырыя віншаванні.

У ВЫДАВЕЦТВЕ «МАЛАДАЯ ГВАРДЫЯ»

Выдавецтва «Маладая гвардыя» выпусціла кнігу Героя Совецкага Саюза В. Казлова «Людзі асобага складу» тыражом 75 тысяч.

Пераклад зроблены Я. Мазальковым.

У гэтым-жа выдавецтве вышла аповесць «Насустрач» Уладзіміра Шахаўца. Пераклад Б. Бур'яна, мастацкае афармленне А. Родчанкі і П. Карэнкага.

За паэзію вялікага грамадскага гучання

(Працяг).

верш «Табе складаю гэты гімн», 1949 г.).

Не вызначаецца навізною верш Максіма Танка аб тым, як ён з каханай збіраў арэхі і хацеў чытаць ліст ляшчынам. А ў вершы «Песня будаўнікоў» над усім пануе рыторыка:

Вось чаму радасна гэтак
Нам уздымаць рыштаванні,
Класці чырвоную цэглу,
Слухаць звон тросаў і кранаў.
Што можа быць прыгажэйшым
Ад светлых гмахаў палацаў,
Ад нашай песні мулярскай,
Ад нашай велічнай працы!

Чытаць падобныя агульныя і нявобразныя радкі тым больш крыўдна, што побач Танк друкуе вершы, напоўненыя глыбокім пачуццём і авеяныя сапраўднай паэзіяй.

Перад паэтам стаіць задача ўзбагачэння сваёй мастацкай палітры новымі фарбамі, стаіць задача пошукаў новага. Такі майстра, як Танк, гэтыя пошукі давядзе да канца.

Не шмат надрукаваў у мінулым годзе Пятро Глебка. Але яго вершы напісаны значна ніжэй творчых мажлівасцей паэта. Нейкая бясстрасная, агульшчына, толькі канстатацыя фактаў адчуваецца ў іх:

Ад светлага ранку да цёмнае ночы
Не цихне вялікай работы размах:
Стаіць за станком працавіты рабочы,
За плугам калгаснік ідзе на палях.
І множацца вынікі радаснай працы:
Па ўсёй Беларусі — ад краю у край.
Растуць гарады, прыгажэюць палацы,
Шуміць на палях залаты ўраджай.
(Верш «У шчаслівай сям'і»).

Такая рыторыка не можа задаволіць ні чытача, ні самога паэта. Вельмі паказальна, што многія з нашых паэтаў ужо ўсвядомілі гэта і накіравалі свае пошукі ў бок стварэння эпічных карцін абагульняючага зместу, праз якія-б совецкі чалавек паўставаў ва ўсёй складанасці свайго духоўнага быцця. У гэтым напрамку мае багаты творчы вопыт і Пятро Глебка, але чамусьці яго занядбаў.

Над тэмамі шырокага філасофскага абагульнення працуе Аркадзь Куляшоў. Апошнія два гады ён прысвяціў напісанню паэмы «Граніца». Аб паэме ў «Комсомольской правде» быў надрукаваны артыкул Сергея Смірнова пад назвай «Ніжэй творчых мажлівасцей». Што было правільнага ў выступленні Сергея Смірнова? У творы сапраўды былі невыразныя вобразы — Марыны, Максіма, была няяснай матывіроўка ўчынкаў Цімоха. Значныя недахопы выявіліся і ў кампазіцыі, асобныя мясціны абцяжарвалі і не праяснялі ідэю. Паэма была напісана ніжэй творчых мажлівасцей А. Куляшова. Аўтар прыслухаўся да крытыкі і грунтоўна перапрацаваў твор. Ён аддаў шмат увагі вобразам Цімоха, Максіма, Марыны — удакладніў іх узаемаадносіны, лінію кахання. Каля шасцісот радкоў паэт зусім выкінуў і амаль столькі-ж напісаў новых. А. Куляшоў знайшоў новы кампазіцыйны стрыжань для ўсяго твора.

Трэба сказаць, што ў новым варыянце паэма «Граніца» прадстаўляе значную з'яву ў нашай совецкай паэзіі. Гэтая паэма з'яўляецца творам глыбока сучасным сённяшнім настроям совецкіх людзей, нягледзячы на тое, што аўтар апавядае нам аб падзеях, аддаленых ад цяперашняга часу больш чым на дваццаць гадоў. Панятце «граніцы» разглядаецца А. Куляшовым у некалькіх аспектах. Па-першае, яна выступае як граніца паміж двума светамі — светам соцыялізма і светам капіталізма, у якім рыхтуюцца спусташэнні, смерць, распальваецца пажар вайны. На гэты пажар у дні Айчыннай вайны наш совецкі народ адказаў пажарам мужнасці, нянавісці, святой помсты. Усё гэта ў паэме выказана не праз публіцыстычныя дэкларацыі, а праз жывыя мастацкія вобразы, якія часамі маюць характар разгорнутай алегорыі (успомнім, напрыклад, сцэну пажару).

Па-другое, у творы «граніца» праходзіць не толькі як мяжа паміж двума светамі, але і як мяжа, якая аддзяляе ўласніцтва ад новага калектывістычнага свету. Адсюль нарадзіліся жывыя і пераканальныя калізіі. Сын кулака Сцяпан, які люта ненавідзіць калгасы і змагаецца за зварот старога ўласніцкага ладу, і, як супроцьстаўленне яму — комсамольцы Максім і Марына — важкі і энтузіясты калгаснага ладу. Складаным з'яўляецца становішча і духоўная эвалюцыя такіх прадстаўнікоў сялянства, як Змітрок, Паліна, Цімох. Вось як вызнае Змітрок сілу ўласніцтва, якая апляла яго нябачнымі путамі:

— Не глядзі, што я чорнай зарос
барадой,
Не зарос барадой, а зарос я—бядой.
Не дзівіся таксама з убораў маіх, —
Гора красіць, Цімох, толькі ракаў адных.
... Вось і стала варыць так, як рака, мяне
Гора ў чорным сваім хутарскім чыгуне.

Паэт даводзіць да канца духоўнае пераражэнне Змітрака таксама, як і Паліны.

Такім чынам, у паэме Аркадзя Куляшова назва «граніца» мае па-філасофску абагулены сэнс. Граніца праходзіць і па зямлі і па сэрцах людзей. Вось чаму спрошчанай з'яўляецца трактоўка некаторых рэцэнзентаў, якія разглядаюць паэму толькі як апісанне выпадку на граніцы.

Уся паэма асветлена ясным святлом нашага совецкага жыцця. Яна дае па-філасофску абагулены і правільны вывад аб тым, што ўся наша барацьба ёсць барацьба за знішчэнне свету ўласніцтва, за знішчэнне тых, якія з даўніх часоў рыхтуюць для нас войны, няшчасці, пакуты.

Багатая палітра фарбаў у гэтай паэме Куляшова. Яшчэ больш сталым зрабілася яго майстэрства, скупымі мастацкія сродкі, глыбокімі мастацкія вобразы, якія даюць магчымасць паэту рабіць шырокія абагульненні. Успомнім карціны, калі юнакі едуць уздоўж граніцы; калі Сцяпан ляжыць за плотам, на якім сядзяць юнакі, і адчувае сябе быццам «за граніцай»: «Гэтай граніцы ніяк яму не перайсці». Успомнім спаборніцтва дзяўчат на жніве, пачатак кірмашу, сходку ў нардоме, тушэнне пажару пажарам, паляванне Змітрака на дыверсантаў, смерць Змітрака, ад'езд юнакоў у горад. І ўсюды твор цэментуецца адной ідэяй. Вось граніца праходзіць па зямлі: «яр, якіх шмат, а па ім — працякала крыніца, ціха каменьчыкі мыла... І гэта— граніца?»... На тым баку паэт бачыць сасну, вельмі падобную на тую, што стаіць на гэты бок граніцы:

Хоць і адна у іх постаць,
Хоць адна ў іх парода,
Доля ў іх розная.
Розная, як і ў народа...

І ў кожным раздзеле твора адчуваецца граніца. Куляшоў дае нам яшчэ адзін цудоўны вобраз: зязюля, якая кукуе тут-жа побач, ужо кукуе з-за кардона, з-за мяжы, хоць яна «пушчы і сэрцы злучае рэхам адным».

А вось яшчэ ўвасабленне граніцы, якая праходзіць па сэрцах людзей. Гэта тая граніца, якой аддзяліў сябе Цімох на хутары ад таварышаў:

Месца, дзе жыў іх таварыш,
сваёй цішынёю
Ім нагадала граніцу
са светам старым.
Гэткі-ж ручай...

Вось чаму нам здаецца, што пры агульнай правільнай крытыцы паэмы А. Куляшова С. Смірноў дапусціў памылку, не заўважыўшы ў творы таго глыбокага абагульнення, якое ў ім ёсць. Вядома, што рамансавая фраза «границы коварный покой», якую як узор для разумення сэнсу «граніцы» прыводзіць С. Смірноў, куды больш бедная, чым той рознабаковы філасофскі пункт гледжання, з якога А. Куляшоў разглядае граніцу. Граніцу паміж двума варожымі светамі, граніцу, якая праходзіць па сэрцах людзей, а не выпадак на граніцы маляваў у сваім творы паэт. Гэта гаворыцца не для таго, каб абараняць А. Куляшова. Вядома, і ў яго ёсць слабыя рэчы. Ніхто і слова не сказаў-бы, калі-б тое, што С. Смірноў пісаў, адносілася да паэм «Простыя людзі», «Прыгоды цымбал» і нават «Песня аб слаўным паходзе» (правільна яе крытыкаваў паэт Сергей Васільеў). Але з паэмай «Граніца» справа больш прынцыповая. На фоне таго, што асобныя паэты разменьваюцца на дробязі ці бяссільна склалі рукі («паэзія ў тупіку»), Аркадзь Куляшоў разам з усімі лепшымі прадстаўнікамі нашай совецкай паэзіі ўпарта шукае новага, ідзе да эпічных форм. І яго «Граніца», як мы бачылі, знаходзіцца ў граніцах паэзіі, і нават высокай, хоць крытыкаваць гэту паэму можна і цяпер за супярэчлівасць вобраза Паліны, за недастатковую выразнасць вобраза Максіма.

Аркадзь Куляшоў у сваёй паэме «Граніца», як і ў сваёй другой выдатнай паэме «Толькі ўперад», побач з яскравай і глыбокай ідэяй паказаў узор працы над вобразам, узбагачаючы нашу паэзію новымі мажлівасцямі.

У той час, як асобныя паэты ўсё яшчэ эксплуатуюць даўно перапетых журавоў, бярозкі, А. Куляшоў дае нам такія смелыя па навізне вобразы, як вобраз восені, якая наладзіла неафіцыйны прыём. Замест караванаў птушак, паэт паказвае караваны жалеза, якія восень «рушыла з месца на поўнач, на захад, на ўсход». З'явілася ў паэта сціслась у слове, якое часамі мае афарыстычны характар. Напрыклад:

Колькі-б год ні прайшло, але з вуснаў
не сцерці
Пацалунак той першы, што першы да
смерці.

Як і раней, і ў гэтым творы А. Куляшоў умее некалькімі радкамі стварыць цэлую карціну:

Бор. Сасновыя шаты.
Ды верас. Ды мох.
Чалавек барадаты.
Цяпельца, дымок.
— Эй, куды ты, браток?
Не спяшайся, браток!

На працягу ўсяго свайго творчага шляху А. Куляшоў, як і ўсе лепшыя нашы паэты, ухіляецца ад «тальяначак» і «паляначак», якія хто-ні-хто ў нас выдае за такую паэзію, што быццам-бы любіць наша моладзь. Але я думаю, што гэтыя бяздумныя вершы могуць толькі прынесці шкоду ў выхаванні. Яны заспакойваюць, прытупляюць нашу пільнасць, нараджаюць фальшывы сентыменталізм. Паэзія мае задачы глыбокага адлюстравання рэчаіснасці, задачы выхаваўчыя. Ды я думаю, што такая рэч А. Куляшова, як паэма «Толькі ўперад», пакінула куды глыбейшы след у свядомасці нашага студэнцтва і моладзі, чым розныя «тальяначкі» і «паляначкі». Мы павінны даць моладзі радасную, асную і прыгожую праўду, а не сіроп.

(Заканчэнне ў наступным нумары).

Галоўны рэдактар Васіль ВІТКА.
Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Дзмітрый АРЛОЎ, Уладзімір АЛОЎНІКАЎ, Алесь БАЧЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Васіль БУРНОСАЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Ірына ЖДАНОВІЧ, Павел КАВАЛЁЎ, Барыс ПЯРКОЎСКІ.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, Совецкая, 34. Тэлефоны: галоўнага рэдактара і намесніка галоўнага рэдактара 2-31-94, адказнага сакратара 2-32-04, аддзелаў літаратуры, мастацтва і публіцыстыкі 2-14-94, выдавецтва і бухгалтэрыі 2-54-45.

АТ 02785. Друкарня «Чырвоны друкар», Мінск, Рэволюцыйная, 12.